Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

123 (5797) | 30 мая 1937 г., нядзеля | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Заўтра адкрываецца 4-я гарадская партыйная канферэнцыя Менска.

Лепшыя большэвікі сталіцы БССР, узброеныя геніяльнымі ўказаннямі вялікага Сталіна, падагуляць вынікі пройдзенаму шляху і намецяць праграму далейшай перабудовы партыйнай работы.

Гарачае прывітанне лепшым большэвікам сталіцы—дэлегатам чацвертай гарадской партыйнай канферэнцыі!

ОЎНАСЦЮ АКТЫВІЗАВАЦЬ ПАРТЫЙНУЮ МАСУ

Заўтра адкрываецца Менская гарадская партыйная канферэнцыя. Узброеныя геніяльнымі дакументамі—гістарычным дакладам таварыша Сталіна і рашэннямі Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б), лепшыя большэвікі Менска, цвет сталічнай партыйнай арганізацыі КП(б)Б, падвядуць вынікі пройдзенаму паміж III і IV партыйнымі канферэнцыямі шляху і намецяць праграму далейшай работы.

Галоўны пункт усёй нашай палітыкі — эканоміка, гаспадарка. Соцыялістычная гаспадарка з'яўляецца эканамічнай базай дыктатуры пролетарыята. Таварыш Сталін не раз растлумачваў гэта, падкрэсліваючы і шкоднасць захапленняў дробнай у шкоду партыйнай работе, перадусім гаспадарчай. «Нельга, — вучыць таварыш Сталін, — шарахацца ад адной крайнасці да другой. Нельга аддзяляць палітыку ад гаспадаркі. Мы не можам уйсці ад гаспадаркі таксама, як не можам уйсці ад палітыкі». Партыйная канферэнцыя не можа таму прайсці міма з'явішчаў і працэсаў, якія адбыліся ў гаспадарцы.

Гаспадарцы Менска ёсць неаспрэчныя поспехі. На аснове ажыццяўлення Менска-сталінскай нацыянальнай палітыкі разгромлены і ліквідаваны эксплуататарскія класы. Прамысловасць, гандаль і транспарт Менска — соцыялістычныя прадпрыемствы. Горад стаў эканамічна-палітычным і культурным цэнтрам краіны. Велізарная большасць насельніцтва горада — працоўныя, якія працуюць на соцыялістычных прадпрыемствах і ўстановах. І горад абавязан гэтым перш за ўсё партыйнай арганізацыі сталіцы БССР.

У кіраўніцтве гаспадаркай, аднак, ёсць сур'ёзныя прарывы і недахопы. Галоўны з іх — у захапленні гаспадаркай, у адсутнасці правільнага спалучэння гаспадарчых поспехаў з поспехамі ў партыйным будаўніцтве і разгорнутай палітычнай работе нашай партыі, у аслабленні кіраўніцтва стаханаўскім рухам.

Больш шумных парадаў і манифестацый, больш рапартаў і прывітанняў, — гаварэнні якой «Звязда», якая з'яўляецца органам менскага гаркома КП(б), вінавата не ў меншай меры, чым іншым, — парадзіла бестурботнасць і дабрэчасць, якія скарыстаў вораг для барацьбы супроць дыктатуры пролетарыята. Ва ўсе прадпрыемствы (завод імя Кірова, завод імя Молатава і інш.) і калгасы (Наркамзем, Наркомасведы) вораг у час працавў беспакарана. Ачагі ворожай работы ў прамысловасці і на транспарце ні ў якім разе яшчэ не паданы. Асаблівую трывогу выклікаюць так званыя дробныя прадпрыемствы, дзе яшчэ больш, а пульс партыйнага і грамадскага жыцця б'е слабей. Вораг у райкомаў сюды яшчэ не пранікла. Але Сталінская Канстытуцыя і абавязванні дайсці не толькі да кожнага рабочага, але і да кожнага выбаршчыка, стала большэвіцкага кіраўніцтва—калі партыйная арганізацыя кіруе гаспадаркай, не паміма гаспадарчых органаў, а праз іх — парушаўся. Парткомы вельмі часта падмянялі гаспадарнікаў, замест таго каб вучыць іх працаваць, што своечасова не выпраўлялася гаркомам.

З другога боку гаркам слаба змагаўся з бюракратычным скажэннем адзінаначалля, няўменнем прыслухоўвацца да голасу мас, якое часамі гранічыла з ігнараваннем сігналаў прапоўных, з парушэннямі большэвіцкага прынцыпу работы, які ажыццяўляецца ў патрабаванні даклада кіраўнікоў «вопытам партыйнай масы, вопытам рабочага класа, вопытам працоўных, вопытам так званых «маленькіх» людзей» (І. Сталін).

Гаркам не толькі не папярэдзіў магчымасці адрыву некаторых кіраўнікоў прадпрыемстваў ад партыйных і шырокіх рабочых мас, але і не заўважыў яго нават тады, калі ён адбыўся. Рэзультаты выбараў парткомаў («Комунарка», шчотачная фабрыка, друкарня імя Сталіна і інш.) адлюстроўваюць яркай ілюстрацыяй гэтага.

Партыйная канферэнцыя не можа прайсці міма ўсіх гэтых фактаў, якія мелі месца ў гаспадарцы. Мабілізаваць комуністаў на барацьбу з гэтымі з'явішчамі, дабіцца увагу партыйнай арганізацыі ўсіх работнікаў, дзе было шкодніцтва, каб ліквідаваць яго вынікі — адна з важных задач партыйнай арганізацыі.

Ключ усіх поспехаў у гаспадарчай рабоце ляжыць у агульным уздыме партыйнай работы. «Гаспадарчыя поспехі, іх замацаванасць і працяжнасць, — вучыць таварыш Сталін, — цалкам і поўнасцю залежаць ад поспехаў партыйна-арганізацыйнай работы і партыйна-палітычнай работы». Пытанні перабудовы партыйнай работы павінны быць у цэнтры ўвагі партыйнай канферэнцыі.

У апошні час партыйна-палітычная работа ажывілася. Прычына ажыўлення палягае ў ліквідацыі парушэнняў прынцыпаў дэмакратычнага цэнтралізма і ў пачаўшымся развароце большэвіцкай самакрытыкі. І гэта цалкам і поўнасцю пацвярджае правільнасць указанняў Пленума ЦК ВКП(б) аб неабходнасці перабудовы партработы, галоўным патрабаваннем якой з'яўляецца правядзенне ў жыццё статута партыі, развіццё крытыкі і самакрытыкі, устанаўленне поўнай адказнасці партыйных органаў перад членамі партыі і поўнай актывізацыі партыйных мас.

Справаздачна-выбарчыя сходы — пачатак перабудовы партыйнай работы. Яны адыгралі буйную ролю ў жыцці партыйнай арганізацыі сталіцы. Выявіўшы высокі ідэйны ўзровень партыйнай арганізацыі, згуртаванасць яе вакол ЦК ВКП(б) і мудрага Сталіна, здольнасць комуністаў бязлітасна змагацца з ворагам, справаздачна-выбарчыя сходы выкрылі буйныя промахі ў пастаноўцы ўсёй партыйнай работы. Тая акалічнасць, што ў час выбараў парторганаў высунуты новыя людзі ў якасці парторгаў і сакратароў парткомаў, несумненна, з'яўляецца станоўчай адзнакай. Гэта новы, свежы струмень, які, несумненна, будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню работы. Аднак, нельга прайсці міма таго факта, што больш 40 проц. сакратароў парткомаў і парторгаў пярвічнымі партарганізацыямі не былі зноў выбраны. Гэта — сведчанне адрыву гаркома ад пярвічных партарганізацый, ніведання становішча спраў у іх, слабай сувязі гаркома з членамі партыі і адсутнасці належнай дапамогі з боку гаркома сакратарамі парткомаў і парторгамі.

У арганізацыі былі парушаны правільныя ўзаемаадносіны паміж членамі партыі і партыйнымі кіраўнікамі, што паслабляла актыўнасць партыйнай масы. І не толькі асуджаць павінна канферэнцыя гэтыя факты, але і даць сакратарам парткомаў ясны адказ на пытанне, як трэба перабудаваць партыйную работу да канца, каб выканаць галоўнае патрабаванне Пленума ЦК ВКП(б) — поўнасцю актывізаваць партыйную масу.

У сваёй практычнай рабоце гаркам забыў аб капіталістычным акружэнні, у прыватнасці пагранічнае становішча горада і той факт, што ў мінулым у Менску арудвалі дробнабуржуазныя і буржуазныя партыі і контрэволюцыйныя арганізацыі, захаваўшыя частку сваіх кадраў і зараз. Гэта было буйнай палітычнай памылкай, якая прывяла да паслаблення пільнасці ў партыйнай арганізацыі. Гэту памылку тым больш трэба выправіць зараз, бо яна здольна прывесці ў далейшым да няправільнага змяшчэння цэнтра пяжару ў партыйнай работе.

Галоўны змест партыйнай работы—павышэнне рэволюцыйнай пільнасці комуністаў.

«Цяпер вузлавым пытаннем для нас з'яўляецца не ліквідацыя тэхнічнай адсталасці нашых кадраў, бо яна ў асноўным ужо ліквідавана, а ліквідацыя палітычнай бясклопатнасці і палітычнай даверлівасці да шкоднікаў, выпадкова атрымаўшых партыйны білет...

Вось чаму стары лозунг аб авалоданні тэхнікай неабходна цяпер дапоўніць новым лозунгам аб авалоданні большэвізмам, аб палітычным выхаванні кадраў і ліквідацыі нашай палітычнай бясклопатнасці». (І. Сталін).

Авалоданне большэвізмам азначае, перш за ўсё, ліквідацыю нашай палітычнай бясклопатнасці—даверлівасці і благалушша. Аб гэтым тым больш неабходна напомніць зараз, бо ў некаторых партыйных арганізацыях зноў наступае самаўпакаенне, хапя падстаў да гэтага ніякіх не існуе. Наадварот, вораг становіцца ўсё хітрэй і паллей. Ён глыбока залязе ў норы, аднак не толькі не ліквідуе сваіх банд, але адчайна працуе над адчаўленнем ужо разгромленых яго арганізацый.

Авалоданне большэвізмам далей азначае палітычнае выхаванне мас і, перш за ўсё, членаў партыі ў духу непрымірымай барацьбы з ворагам, у духу рашучага яго разгрому.

Комуністы на справаздачна-выбарчых сходах дэманстравалі поўнае разуменне сместу лозунга аб авалоданні большэвізмам, жорстка крытыкуючы не толькі становішча арганізацыі агітацыі і прапаганды, але абстрактнасць і бяззубасць, з якой часамі прыпадносяцца ў нас членам гурткоў, грамадскія навукі, асабліва гісторыя партыі. Комуністы правільна патрабуюць карэннага паляпшэння прапаганды марксізма-ленінізма на аснове тых указанняў, якія даны таварышам Сталіным у яго дакладзе і заўвагах на падручнікі па гісторыі партыі.

Канферэнцыя Менскай партыйнай арганізацыі адкрываецца ў момант, калі справаздачна-выбарчая кампанія ва ўсёй КП(б)Б ужо завершана. І гэта робіць яе работу асабліва адказнай. Няма сумнення, што канферэнцыя большэвікоў сталіцы БССР не толькі зможа дасягнуць ўзровень перабудовы партыйнай работы, але, узначаліўшы і ўзняўшы самакрытыку і рэволюцыйную пільнасць яшчэ вышэй, карыстаючыся ўказаннямі таварыша Сталіна, дасць праграму далейшай перабудовы партыйнай работы.



Начальнік экспедыцыі на Паўночны полюс Отто Юльевіч Шмідт.

РАДЫЁГРАМА З ПАЎНОЧНАГА ПОЛЮСА

МАСКВА, ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАЎНОЧНАГА МОРСКАГА ШЛЯХУ, ТАСС, «ПРАВДА», «ИЗВЕСТИЯ»

ПАЎНОЧНЫ ПОЛЮС, 28 мая. (Радыё). Учора Совет Лігі нацый прыступіў да абмеркавання звароту іспанскага ўрада. Пасля прамовы прадстаўніка Іспаніі Альварэс дэль Вайо выступіў народны камісар замежных спраў СССР тав. М. М. Літвінаў:

«Прамова паважанага прадстаўніка Іспаніі і разасланыя ім дакументы вычарпальна асвятлілі фактычны бок справы, на якім наўрад ці ёсць патрэба спыняцца. Перад намі зусім ясная справа, якая не патрабуе далейшых праверак і расследвання. Перад намі бясспрэчны выпадак гвалтоўнага ўводу іншаземных узброеных сіл на тэрыторыю аднаго з членаў Лігі нацый — выпадак агрэсіі ў грубейшай форме.

Некаторыя міжнародныя акцыі (дзеянні), якія прадпрымаліся за апошні год па практычных прапановах, — пагадненне аб неўмяшанні ў іспанскія справы, устанаўленне кантролю, прапанова аб перамір'і, зварот да ваюючых бакоў, — несумненна, скажаюць і зацямняюць фармальны бок справы, ствараючы ўражанне, быццам гутарка ідзе аб роўнапраўных ваюючых баках. На самай-жа справе мы маем, з аднаго боку, законна прызнаны ўсімі без выключэння дзяржавамі і Лігай нацый урад, створаны на аснове іспанскай канстытуцыі і дэмакратычнага выбарчага права, атрымаўшы незадоўга да ўзнікнення абмяркоўзлемай падзеі вотум давер'я іспанскага народу, урад, адказны за выкананне законаў краіны, за парадак, за дысцыпліну ў арміі і флоце і абавязаны падаўляць, калі патрэбна сілай, усякі замах на змену існуючага ладу, замахі на інтарэсы шырокіх народных мас і ўсякія мяцежы і беспарадкі.

З другога боку, — кучка генералаў і афіцэраў, парушыўшых свой вайсковы доўг, паўстаўшых супроць законнага ўрада і канстытуцыі краіны, пачаўшых ваенныя дзеянні пры дапамозе, галоўным чынам, мараканскіх войск. Я дазваляю сабе напомніць аб гэтых простых, бясспрэчных фактах з прычыны таго, што аб іх пачынаюць забываць. Пачынаюць забываць, што ў даным выпадку не можа быць і гутаркі аб роўнапраўі бакоў.

Іншаземныя ўрады маюць права ўваходзіць у зносіны з іспанскім ураладам, рабіць з імі любыя камерцыйныя здзелкі, аж да продажу ваенных матэрыялаў, не парушаючы ніякіх міжнародных норм і абавязацельстваў. Зносіны-ж з мяцежнымі генераламі, а тым больш снабжэнне іх ваенным матэрыялам, з'яўляецца класічным прыкладам умяшання ва ўнутраныя справы іншай дзяржавы.

Калі-б іспанскія падзеі абмежаваліся ўнутранымі неладамі, барацьбой урада супроць мяцежнікаў, то Лізе нацый не толькі не было-б чаго рабіць з гэтым пытаннем, але гэтыя падзеі даўно спыніліся-б.

Усякі бесстаронні чалавек, знаёмы з суадносінамі сіл, павінен прызнаць, што законны іспанскі ўрад даўно справіўся-б з мяцежам. Мадрыд і іншыя іспанскія гарады не былі-б спустошаны і разбураны, і іспанскаму народу не прышлося-б аплакваць гібель дзесяткаў тысяч мужчын, жанчын і дзяцей, знішчэнне лепшых прадстаўнікоў іспанскага мастацтва і навукі. Справа не набыла-б міжнароднага характару, і не толькі ў Іспаніі быў-бы даўно ўстаноўлен парадак, але і не быў-бы парушан міжнародны парадак.

На жаль, апублікаваныя дакументы з гранічнай пераканальнасцю даказваюць, што самы мяцеж генералаў быў падрыхтаваны і арганізаваны пры іншаземным падбухторванні з іншаземнай дапамогай. Больш таго, у першы-ж дзень мяцежу мяцежнікі сталі снабжацца зброяй, авіяцыяй, ваеннымі інструктарамі і лётчыкамі з-за граніцы. Размеры гэтага снабжэння па меры развіцця падзей усё больш і больш павялічваліся, і дапамога мяцежнікам стала аказвацца не толькі ваенным, але і чалавечым матэрыялам. Заключэнне пагаднення аб неўмяшанні ў іспанскія справы не спыніла аказанне гэтай дапамогі паўстанцам. У Іспанію на дапамогу мяцежнікам хлынулі дзесяткі тысяч добра абучаных і ўзброеных іншаземцаў, а ніх многія знаходзіліся на ваеннай службе іншаземных дзяржаў і склалі на тэрыторыі Іспаніі значныя вайсковыя часці. Буйныя баі з іспанскай рэспубліканскай арміяй вяліся ў некаторых выпадках выключна гэтымі іншаземнымі вайсковымі часцямі, пад камандаваннем іншаземных генералаў. Іспанскія гарады падвяргаюцца бамбардыроўцы іншаземных самалётаў, кіруемых іншаземнымі пілотамі. Чацвертая частка Мадрыда, увесь горад Герніка і мноства іншых гарадоў і вёсак знішчаны іншаземнай авіяцыяй.

Можна сказаць, што ў сучасны момант іспанскай рэспубліканскай арміі прыходзіцца весці ўзброеную барацьбу не толькі супроць мяцежнікаў, колькі супроць уварваўшыхся ў краіну іншаземных інтэрвентаў. Такім чынам, адзін з членаў Лігі падвергся іншаземнаму нашэсцвію і пагрозе парушэння яго тэрытарыяльнай цэласнасці і палітычнай незалежнасці.

Але справа ідзе не аб адной Іспаніі. Іспанскія падзеі стварылі адну з найвялікшых пагроз еўрапейскаму і ўсеагульнаму міру. Пагроза гэта ўзнікае з прычыны спробы ўзброенага ўмяшання ва ўнутраныя справы еўрапейскай дзяржавы, спробы навязаць народу гэтай дзяржавы чужы яму ўнутраны рэжым, а галоўным чынам замежна-палітычную арыентацыю і пад прыкрыццём гэтага ўмяшання пазбавіць гэту краіну яе незалежнасці і падпарадкаваць яе феруле (рэжыму) іншых дзяржаў. Калі-б гэта спроба ўдалася і прайшла беспакарана, то не будзе гарантыі ў тым, што яна не будзе паўтарацца і ў іншых краінах.

Няма гарантыі ў тым, што не будзе зроблена ў бліжэйшы-ж час новая спроба выклікаць мяцеж у якой-небудзь іншай краіне, прызнаць правадыра мяцежнікаў галавой урада, увесці туды на дапамогу мяцежнікам іншаземныя войскі і іншаземную зброю і ажыццявіць такім чынам агрэсію, напыянальную палітыку інтэрвеніраваўшай дзяржавы. У інтэрвенцыі праяўляецца тэндэнцыя, па прыкладу рэлігійных войн мінулага, пачаць серыю новых войн і пад прыкрыццём барацьбы ідэалогій і палітычных рэжымаў ажыццяўляць палітыку агрэсіі і экспансіі. Не трэба забываць, што ў Іспаніі ў момант узнікнення мяцежу існаваў урад, па сваёй праграме падобны да ўрадаў, існуючых у многіх іншых краінах.

Урад краіны, які я прадстаўляю, мае сваю ідэалогію, ён, вядома, вельмі рад быў-бы, калі-б гэтай ідэалогіяй пранікліся і іншыя краіны. Аднак, ён ніколі не імкнуўся і не будзе імкнуцца якімі-б там ні было шляхамі, а тым больш гвалтоўнымі, навязаць сваю ідэалогію іншым дзяржавам. Мы, як дзяржава, мала цікавіліся тым ладам, які існаваў у Іспаніі, з якою к моманту мяцежу мы не мелі нават ні дыпламатычных ні консульскіх адносін, дзе ў гэты час не было ні аднаго совецкага грамадзяніна. Мы хочам толькі аднаго, каб іспанскі народ пасля скančэння цяперашніх падзей мог-бы, як да мяцежу, мець той урад, які ён сам хоча і які ён добраахвотна выбраў на падставе ім самім устаноўленай канстытуцыі. Таму прадстаўляемы мною ўрад з самага пачатку заявіў, што ён падтрымае любую акцыю (дзеянне), накіраваную на ўдаленне з радоў ваюючых у Іспаніі ўсіх неіспанскіх элементаў з тым, каб барацьба, якая там адбываецца, магла вырашыцца сіламі адных іспанцаў.

Акалічнасці справы поўнасцю апраўдваюць зварот іспанскага ўрада ў Лігу нацый. Мы ведаем, што ў некаторых колах гэты зварот крытыкуюць і нават асуджаюць. Ёсць людзі, якія лічаць сябе прыхільнікамі Лігі нацый і якія думаюць, што Лігу нацый можна захаваць у жывых толькі пры ўмове, калі ад яе ніхто нічога не будзе прасіць і нічога не будзе чакаць і што ўсякі зварот да Лігі ў якой-небудзь сур'ёзнай міжнароднай справе з'яўляецца замахам на існаванне Лігі. Гэтыя людзі хацелі-б ператварыць Лігу ў «універсальную» мумію і любаваца яе нерухомасцю і бестурботным спакоем. Іспанскі ўрад, як відаць, думае не так і мяркуе, наадварот, што Ліга нацый будзе канчаткова асуджана калі не на фізічную, то на маральную смерць, калі яна будзе зусім ігнараваца і аставацца ў старане пры разгортванні такіх падзей, якія адбываюцца зараз на Іберыйскім поўвостраве (Іспаніі).

Іспанія належыць да ліку першапачатковых членаў Лігі і прымала дзейны ўдзел ва ўсіх работах Лігі. Яна лаяльна выконвала ўсе свае абавязкі ў якасці члена Лігі. Яна займае поўнастаяннае месца ў Совеце Лігі, і яна не злоўжывала гэтай сваёй прывілеяй, каб адмежавацца ад агульных рашэнняў і акцый Лігі нацый і процінастаўляць сваю індывідуальную думку грамадскай думцы астатніх членаў Лігі.

Вось чаму трэба толькі ахвяляцца скромнасці і ўмеранасці Іспаніі, якая, не гледзячы на няшчасце, якое на яе абрушылася, у цяжкую для яе гадзіну, не абцяжарвала Лігу сваімі зваротамі, хоць яна на гэта мела поўнае фармальнае і маральнае права.

І калі яна цяпер з гэтай скромнасцю, ведаючы абмежаванасць дапамогі, якой яна можа чакаць ад Лігі, не спасылаючыся ні на якія падыходзячыя да данага выпадку артыкулы статута, усё-ж да нас звярнулася, я хачу выказаць упэўненасць, што Совет Лігі нацый не толькі ў інтарэсах Іспаніі, але і ў інтарэсах міжнароднай справядлівасці і захавання міру, а таксама ў інтарэсах самой Лігі скажа сваё важкае слова і акажа іспанскаму народу магчымае максімальнае падтрыманне».

ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ ЎСЕСАЮЗНАЙ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў)
таварышу СТАЛІНУ

IV Маскоўская гарадская партыйная канферэнцыя шле Вам, нашаму любімаму правадыру, настаўніку і другу — гарачае большэвіцкае прывітанне!

Канферэнцыя ад імя ўсіх большэвікоў пролетарскай сталіцы выражае сваю гарачую любоў і бязмежную адданасць ленінска-сталінскаму Цэнтральнаму Камітэту і Вам, наш родны таварыш Сталін.

Мы добра памятаем Ваша ўказанне на Пленуме Цэнтральнага Камітэта партыі аб тым, што трэба пастомна павышаць нашу пільнасць, бо, пакуль існуе капіталістычнае акружэнне, будуць існаваць у нас і шкоднікі, шпіёны, дыверсанты і забойцы.

Канферэнцыя запэўнае Вас, што большэвікі маскоўскай арганізацыі, згуртоўваючы рабочых і ўсіх працоўных Масквы вакол генеральнай лініі партыі, зробяць усё, каб канчаткова выкарчаваць і знішчыць астаткі ўсіх ворагаў партыі, усіх трацкістска-правых двурушнікаў — гэтых агентаў японска-нямецкага фашызма.

Большэвікі Масквы прыкладуць усе намаганні к таму, каб у найкарацейшы тэрмін перамагчы недахопы ў партыйна-палітычнай рабоце, ліквідаваць да канца ідыёцкую хваробу — бясклопатнасць, умацоўваць сувязь з масамі, узнімаць яшчэ вышэй іх рэволюцыйную пільнасць, палітычна загартоўваць і выхоўваць іх у духу большэвізма і яшчэ цясней, мацней згуртаваць рады большэвікоў і працоўных Масквы вакол ленінска-сталінскага Цэнтральнага Камітэта партыі для далейшай барацьбы за комунізм.

Няхай жыве наша вялікая комуністычная партыя, якая прывяла нашу краіну да поўнай перамогі соцыялізма і забяспечыла трыумф вялікага вучэння Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна!

Няхай жыве наш вялікі правадыр таварыш СТАЛІН!

ЗАКРЫЛАСЯ IV МАСКОЎСКАЯ ГАРАДСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ВКП(б)

28 мая ўвечары закрылася IV маскоўская гарадская канферэнцыя ВКП(б).

Канферэнцыя аднадушна прыняла рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу тав. Н. С. Хрушчова, якая прызнае палітычную лінію Маскоўскага гарадскога камітэта ВКП(б) правільнай і работу здавальняючай.

Канферэнцыя выбрала пленум Маскоўскага гарадскога камітэта ВКП(б) у складзе 65 членаў і 20 кандыдатаў і рэвізійную камісію ў складзе 9 членаў.

Канферэнцыя аднадушна з вялікім уздымам прыняла прывітанне таварышу Сталіну.

Канферэнцыя закрылася кароткай заключнай прамовай тав. Н. С. Хрушчова.

(БЕЛТА).

III ПЛЕНУМ ЦК ЛКСМБ

26 — 29 мая адбыўся III пленум ЦК ЛКСМБ. Пленум абмеркаваў наступныя пытанні:

1. Рашэнні III пленума ЦК ВЛКСМ пра «Падрыхтоўку комсамольскіх арганізацый да выбараў у Советы па новай выбарчай сістэме і недахопах палітыка-выхаваўчай работы ў комсамоле» (дакладчык тав. Аўгустайціс).

2. Аб тэрмінах справаздач і выбараў комсамольскіх органаў (дакладчык тав. Канаеў).

Пленум выразіў рад арганізацыйных пытанняў: зацвердзіў загадчыкам аддзела рабочай моладзі і членам бюро ЦК ЛКСМБ тав. Абугава, зацвердзіў загадчыкам аддзела піонераў тав. Даговіча і загадчыкам аддзела сялянскай моладзі тав. Сазонава.

У рабоце пленума прымалі ўдзел сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шарангоўіч і сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Файнберг.

Сход актыва Менскай арганізацыі ЛКСМБ

Учора ў вялікай зале Дома партактыва пачаўся сход актыва менскай арганізацыі ЛКСМБ па пытанню вынікаў III пленума ЦК ВЛКСМ. Даклад пра рашэнні пленума аб падрыхтоўцы комсамольскіх арганізацый да выбараў у Советы па новай выбарчай сістэме і аб справаздачах і выбарах комсамольскіх органаў зрабіў сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Аўгустайціс.

Учора пачаліся спрэчкі па дакладу. Аднак, у іх адчуваецца яшчэ вельмі агульны тон і нізкі ўзровень крытыкі недахопаў работы менскай гарадской арганізацыі ЛКСМБ, і асабліва нізкі ўзровень самакрытыкі.

У рабоце актыва прымае ўдзел сакратар ЦК ВЛКСМ тав. Файнберг.

Сёння, у 5 гадзін вечара, — працяг работы актыва.

НА ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ

ПРАМОВА тав. М. М. ЛІТВІНАВА

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі, месца прабываньне Лігі нацый), 29 мая (БЕЛТА). Учора Совет Лігі нацый прыступіў да абмеркавання звароту іспанскага ўрада. Пасля прамовы прадстаўніка Іспаніі Альварэс дэль Вайо выступіў народны камісар замежных спраў СССР тав. М. М. Літвінаў:

«Прамова паважанага прадстаўніка Іспаніі і разасланыя ім дакументы вычарпальна асвятлілі фактычны бок справы, на якім наўрад ці ёсць патрэба спыняцца. Перад намі зусім ясная справа, якая не патрабуе далейшых праверак і расследвання. Перад намі бясспрэчны выпадак гвалтоўнага ўводу іншаземных узброеных сіл на тэрыторыю аднаго з членаў Лігі нацый — выпадак агрэсіі ў грубейшай форме.

Некаторыя міжнародныя акцыі (дзеянні), якія прадпрымаліся за апошні год па практычных прапановах, — пагадненне аб неўмяшанні ў іспанскія справы, устанаўленне кантролю, прапанова аб перамір'і, зварот да ваюючых бакоў, — несумненна, скажаюць і зацямняюць фармальны бок справы, ствараючы ўражанне, быццам гутарка ідзе аб роўнапраўных ваюючых баках. На самай-жа справе мы маем, з аднаго боку, законна прызнаны ўсімі без выключэння дзяржавамі і Лігай нацый урад, створаны на аснове іспанскай канстытуцыі і дэмакратычнага выбарчага права, атрымаўшы незадоўга да ўзнікнення абмяркоўзлемай падзеі вотум давер'я іспанскага народу, урад, адказны за выкананне законаў краіны, за парадак, за дысцыпліну ў арміі і флоце і абавязаны падаўляць, калі патрэбна сілай, усякі замах на змену існуючага ладу, замахі на інтарэсы шырокіх народных мас і ўсякія мяцежы і беспарадкі.

З другога боку, — кучка генералаў і афіцэраў, парушыўшых свой вайсковы доўг, паўстаўшых супроць законнага ўрада і канстытуцыі краіны, пачаўшых ваенныя дзеянні пры дапамозе, галоўным чынам, мараканскіх войск. Я дазваляю сабе напомніць аб гэтых простых, бясспрэчных фактах з прычыны таго, што аб іх пачынаюць забываць. Пачынаюць забываць, што ў даным выпадку не можа быць і гутаркі аб роўнапраўі бакоў.

Іншаземныя ўрады маюць права ўваходзіць у зносіны з іспанскім ураладам, рабіць з імі любыя камерцыйныя здзелкі, аж да продажу ваенных матэрыялаў, не парушаючы ніякіх міжнародных норм і абавязацельстваў. Зносіны-ж з мяцежнымі генераламі, а тым больш снабжэнне іх ваенным матэрыялам, з'яўляецца класічным прыкладам умяшання ва ўнутраныя справы іншай дзяржавы.

Калі-б іспанскія падзеі абмежаваліся ўнутранымі неладамі, барацьбой урада супроць мяцежнікаў, то Лізе нацый не толькі не было-б чаго рабіць з гэтым пытаннем, але гэтыя падзеі даўно спыніліся-б.

Усякі бесстаронні чалавек, знаёмы з суадносінамі сіл, павінен прызнаць, што законны іспанскі ўрад даўно справіўся-б з мяцежам. Мадрыд і іншыя іспанскія гарады не былі-б спустошаны і разбураны, і іспанскаму народу не прышлося-б аплакваць гібель дзесяткаў тысяч мужчын, жанчын і дзяцей, знішчэнне лепшых прадстаўнікоў іспанскага мастацтва і навукі. Справа не набыла-б міжнароднага характару, і не толькі ў Іспаніі быў-бы даўно ўстаноўлен парадак, але і не быў-бы парушан міжнародны парадак.

На жаль, апублікаваныя дакументы з гранічнай пераканальнасцю даказваюць, што самы мяцеж генералаў быў падрыхтаваны і арганізаваны пры іншаземным падбухторванні з іншаземнай дапамогай. Больш таго, у першы-ж дзень мяцежу мяцежнікі сталі снабжацца зброяй, авіяцыяй, ваеннымі інструктарамі і лётчыкамі з-за граніцы. Размеры гэтага снабжэння па меры развіцця падзей усё больш і больш павялічваліся, і дапамога мяцежнікам стала аказвацца не толькі ваенным, але і чалавечым матэрыялам. Заключэнне пагаднення аб неўмяшанні ў іспанскія справы не спыніла аказанне гэтай дапамогі паўстанцам. У Іспанію на дапамогу мяцежнікам хлынулі дзесяткі тысяч добра абучаных і ўзброеных іншаземцаў, а ніх многія знаходзіліся на ваеннай службе іншаземных дзяржаў і склалі на тэрыторыі Іспаніі значныя вайсковыя часці. Буйныя баі з іспанскай рэспубліканскай арміяй вяліся ў некаторых выпадках выключна гэтымі іншаземнымі вайсковымі часцямі, пад камандаваннем іншаземных генералаў. Іспанскія гарады падвяргаюцца бамбардыроўцы іншаземных самалётаў, кіруемых іншаземнымі пілотамі. Чацвертая частка Мадрыда, увесь горад Герніка і мноства іншых гарадоў і вёсак знішчаны іншаземнай авіяцыяй.

Можна сказаць, што ў сучасны момант іспанскай рэспубліканскай арміі прыходзіцца весці ўзброеную барацьбу не толькі супроць мяцежнікаў, колькі супроць уварваўшыхся ў краіну іншаземных інтэрвентаў. Такім чынам, адзін з членаў Лігі падвергся іншаземнаму нашэсцвію і пагрозе парушэння яго тэрытарыяльнай цэласнасці і палітычнай незалежнасці.

Але справа ідзе не аб адной Іспаніі. Іспанскія падзеі стварылі адну з найвялікшых пагроз еўрапейскаму і ўсеагульнаму міру. Пагроза гэта ўзнікае з прычыны спробы ўзброенага ўмяшання ва ўнутраныя справы еўрапейскай дзяржавы, спробы навязаць народу гэтай дзяржавы чужы яму ўнутраны рэжым, а галоўным чынам замежна-палітычную арыентацыю і пад прыкрыццём гэтага ўмяшання пазбавіць гэту краіну яе незалежнасці і падпарадкаваць яе феруле (рэжыму) іншых дзяржаў. Калі-б гэта спроба ўдалася і прайшла беспакарана, то не будзе гарантыі ў тым, што яна не будзе паўтарацца і ў іншых краінах.

Няма гарантыі ў тым, што не будзе зроблена ў бліжэйшы-ж час новая спроба выклікаць мяцеж у якой-небудзь іншай краіне, прызнаць правадыра мяцежнікаў галавой урада, увесці туды на дапамогу мяцежнікам іншаземныя войскі і іншаземную зброю і ажыццявіць такім чынам агрэсію, напыянальную палітыку інтэрвеніраваўшай дзяржавы. У інтэрвенцыі праяўляецца тэндэнцыя, па прыкладу рэлігійных войн мінулага, пачаць серыю новых войн і пад прыкрыццём барацьбы ідэалогій і палітычных рэжымаў ажыццяўляць палітыку агрэсіі і экспансіі. Не трэба забываць, што ў Іспаніі ў момант узнікнення мяцежу існаваў урад, па сваёй праграме падобны да ўрадаў, існуючых у многіх іншых краінах.

Урад краіны, які я прадстаўляю, мае сваю ідэалогію, ён, вядома, вельмі рад быў-бы, калі-б гэтай ідэалогіяй пранікліся і іншыя краіны. Аднак, ён ніколі не імкнуўся і не будзе імкнуцца якімі-б там ні было шляхамі, а тым больш гвалтоўнымі, навязаць сваю ідэалогію іншым дзяржавам. Мы, як дзяржава, мала цікавіліся тым ладам, які існаваў у Іспаніі, з якою к моманту мяцежу мы не мелі нават ні дыпламатычных ні консульскіх адносін, дзе ў гэты час не было ні аднаго совецкага грамадзяніна. Мы хочам толькі аднаго, каб іспанскі народ пасля скančэння цяперашніх падзей мог-бы, як да мяцежу, мець той урад, які ён сам хоча і які ён добраахвотна выбраў на падставе ім самім устаноўленай канстытуцыі. Таму прадстаўляемы мною ўрад з самага пачатку заявіў, што ён падтрымае любую акцыю (дзеянне), накіраваную на ўдаленне з радоў ваюючых у Іспаніі ўсіх неіспанскіх элементаў з тым, каб барацьба, якая там адбываецца, магла вырашыцца сіламі адных іспанцаў.

Акалічнасці справы поўнасцю апраўдваюць зварот іспанскага ўрада ў Лігу нацый. Мы ведаем, што ў некаторых колах гэты зварот крытыкуюць і нават асуджаюць. Ёсць людзі, якія лічаць сябе прыхільнікамі Лігі нацый і якія думаюць, што Лігу нацый можна захаваць у жывых толькі пры ўмове, калі ад яе ніхто нічога не будзе прасіць і нічога не будзе чакаць і што ўсякі зварот да Лігі ў якой-небудзь сур'ёзнай міжнароднай справе з'яўляецца замахам на існаванне Лігі. Гэтыя людзі хацелі-б ператварыць Лігу ў «універсальную» мумію і любаваца яе нерухомасцю і бестурботным спакоем. Іспанскі ўрад, як відаць, думае не так і мяркуе, наадварот, што Ліга нацый будзе канчаткова асуджана калі не на фізічную, то на маральную смерць, калі яна будзе зусім ігнараваца і аставацца ў старане пры разгортванні такіх падзей, якія адбываюцца зараз на Іберыйскім поўвостраве (Іспаніі).

Іспанія належыць да ліку першапачатковых членаў Лігі і прымала дзейны ўдзел ва ўсіх работах Лігі. Яна лаяльна выконвала ўсе свае абавязкі ў якасці члена Лігі. Яна займае поўнастаяннае месца ў Совеце Лігі, і яна не злоўжывала гэтай сваёй прывілеяй, ка

АБ ТАК ЗВАНЫХ МАЛЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ

У гэтай карэспандэнцыі мы хочам на прыкладзе з аднаго малага прадпрыемства Менска (Аўтарамстанцыя) паказаць, да чаго даводзіць адсутнасць увагі да так званых маленькіх прадпрыемстваў.

Аўтарамстанцыя налічвае 150 рабочых. Партарганізацыя складаецца з 13 чалавек і комсамольская арганізацыя — з 20. У Сталінскім райкоме партыі Аўтарамстанцыя папала ў лік тых прадпрыемстваў, якія выпалі з яго поля зроку. Сюды работнікі райкома партыі да апошняга часу амаль не заглядвалі. Партарганізацыя, пазбаўленая жывога кіраўніцтва райкома сама, па сутнасці, ніякай работы не праводзіла.

Гэта было на руку ворагам. Карыстаючыся абсалютнай бескантрольнасцю, вораг нагла, на вачах усіх арудваў. Тут штучна затрымліваліся на доўгі час машыны ў рамонце, сам рамонт рабіўся па-шкодніцку, папаваў крадзеж і інш. У той час як станцыя мела дэфіцыт, Герасімаў даваў трэсту фіктыўныя весткі аб наяўнасці прыбытку. У рэзультаце—ён атрымліваў адлічэнні ў дырэктарскі фонд, а сродкі гэтыя растранжыраў сярод сваіх любзей, раздаючы прэміі направа і налева. Разам з Герасімавым рабілі брудныя справы былы загадчык сталом заказаў Палутнюк, эканаміст-планавік Гаўрылік і інш.

Усе шкодніцкія махінацыі адбываліся на вачах партыйнай арганізацыі, але тут да таго была прытуплена большэвіцкая пільнасць, што не здолелі выкрыць ворагаў. Нават пасля Пленума ЦК ВКП(б) Герасімаў праводзіў сваю шкодную работу. Толькі ў канцы красавіка, калі органы НКУС ускрылі яго, у партарганізацыі заварушыліся: «Выходзіць, зноў прашляпілі», і (у каторы раз?) прызнавалі сваю віну, палітычную бясклопатнасць і разявацтва.

Тут нельга абыйсці таго факта, што асобныя сігналы аб агіднай дзейнасці Герасімава меў і Сталінскі райком партыі. Але інструктар райкома т. Зальцман, будучы адарван ад жыцця прадпрыемства па сутнасці, не толькі не спрыяў павышэнню пільнасці, але, наадварот — дамабілізоўваў партыйную арганізацыю.

Дый і зараз ніякіх змен у арганізацыі не адбылося. Большасць членаў партыі ніхто не вучыцца. Існуючы адзін гурток па вывучэнню гісторыі партыі наведваюць 3—4 чалавекі, і то неакуратна. Канцылярская школа не працуе. Не вучацца і спачуваючыя. Такое-ж становішча і ў комсамольскай арганізацыі (сакратар камітэта Дзядзюшкін). Адзіная комсамольская школа не працуе. Што пасля гэтага гаварыць аб палітмасавай рабоце сярод беспартыйных? Яе зусім няма. Вылучылі 5 агітатараў, але яны бяздзейнічаюць. Тут нават не правялі ніякай растлумачальнай работы ў сувязі з пераходам на новыя нормы выпрацоўкі. Не дзіўна, што на гэтай глебе шмат непаразуменняў.

Тым часам кулак Аладка пачаў праводзіць контрэволюцыйную работу. Ён выступіў супроць стаханаўскага руху, супроць увядзення новых норм, паклёпнічаючы на партыю. Лепшыя людзі прадпрыемства далі адпор гэтаму кулацкаму агітпропу. Яны патрабавалі выгнаць яго з прадпрыемства. Агульны сход рабочых завода палтрымаў пастанову цэхавага схода аб звальненні Аладкі. Але на дапамогу апошняму прышоў паслужлівы ЦСПСВ. Не пабыўшы нават на месцы, не пацікавіўшыся як належыць справай, чыноўнікі з ЦСПСВ прапанавалі аднавіць Аладку на рабоце. Ён і зараз працягвае на прадпрыемстве сваю гнусную работу. Пры чым, у яго зараз ужо аказаўся памочнік па варожай агітацыі... комсамолец, член камітэта ЛКСМБ Малюкевіч. Гэты кулацкі падпявала слова ў слова паўтарае тое-ж самае, што і Аладка. Малюкевіч выступае з антысовецкімі прамовамі, паклёпнічае на наш лад, супрацьпаставляецца ўвядзенню новых норм. А партыйная і комсамольская арганізацыі гэтага не заўважваюць.

Мы зацікавіліся, якім чынам малады рабочы, комсамолец Малюкевіч стаў зброяй у руках кулака. Аказваецца, Аладка і Малюкевіч жывуць у адным заводскім інтэрнаце. Там жыве яшчэ 18 чалавек. Ні партыйнай, комсамольскай і прафсаюзнай арганізацыі ніхто ў інтэрнаце не бывае. Масавая работа не праводзіцца. Не выпадкова, што тут верхаводзіць кулак Аладка. Карыстаючыся палітычнай бясклопатнасцю заводскіх арганізацый, ён праводзіць сваю контрэволюцыйную агітацыю. Гэты самы Аладка, прабраўшыся нейкім чынам у члены брыгады садзейнасці міліцыі, скарыстоўвае гэта таксама для сваіх варожых мэт. Ён тэрарызуе некаторых рабочых, запалохвае высяленнем іх (Якавіцкую) і інш.

Бясспрэчна, калі-б памянёнае прадпрыемства з боку райкома партыі мела дастатковую ўвагу і дапамогу, тут не было-б такіх буйных правалаў у рабоце.

Р. ДОДЗІН.

Агітатар менскага машынабудаўнічага завода імя Кірава тав. І. І. Козляк гутарыць з рабочымі новага механічнага цэха аб рашэннях пленума ВЦСПС па дакладу тав. Шверніка. Фото Я. Салавейчыка.

НЕДАХОПЫ ПАЛІТЫЧНАЙ АГІТАЦЫІ

6 чэрвеня на фабрыцы імя 8 сакавіка чынаюцца справаздачна-выбарчыя сходы прафорганаў па новай сістэме. Агітатары лектах вывучаюць з рабочымі стэнограму аб выбарах і іншыя матэрыялы пленума ВЦСПС. Гэта работа па-новай ці з'яўляецца рэпетыцыяй для ўсіх рабочых у падрыхтоўцы да выбараў Вярхоўны Совет.

Хто дапамагае агітатарам у гэтай баце? Партыйны кабінет, які ў чаргу абавязан дапамагчы агітатарам, стаіць у баку. Пацвярджаць гэта хаця-б адным яго выпадкам. Да гэтага часу сцены кабінета запоўнены выцвілымі матэрыяламі і літаратуры да 1 Мая даўно ўстаралая. За гэты час агітатары гутарылі аб Дні друку і аб разведвыпытаннях. Сёння рабочыя пікавяцца дадатнымі дасягненнямі совецкіх пісьменнікаў, якія прыляцелі на Паўночны полюс, але нічога мы не знаходзім у партканце.

Агітатары Бухман, Негневіцкі і інш., з якімі мы гутарылі, заяўляюць, што яны асабліва адчуваюць патрэбу ў кваліфікаванай кансультацыі па пытаннях міжнароднага становішча. Але адчуваюць яе рэдка. І не толькі па міжнароднаму становішчу.

— Мы хочам, каб райком партыі меў мае кваліфікаваныя кадры, больш арганізоўваў для агітатараў спецыяльныя тэарэтычныя даклады на розныя тэмы, гаворыць агітатар Бухман.—Бываюць даклады, арганізаваныя для агітатараў-прапагандыстаў у гарадскім ці раённым маштабе, не даюць таго, у чым адчуваю патрэбу агітатар. Так было з інструктыўным дакладам да 1 Мая. Дакладчык культпропа гаркома Задзярнюк не ўмеў як практычна будаваць даклад, гаворыць на што звярнуць галоўную ўвагу.

Якія недахопы ў рабоце саміх агітатараў? Агітатар Бухман правяло́зіць практычную агітацыю ў вытворчай брыгадзе. За гэты час брыгада, раней адстаючая ў вытворчых адносінах, заняла першае месца на фабрыцы. Бухман ведае многіх любзей, як Жораву, Грынеевіч, Глушэвіч, Дзізік і іншых, якія вырасла палітычна. Але, апрача гутарак, рабочыя не хапаюцца да агітатара за раслумачэннем ці іншага палітычнага пытання.

Гэта адносіцца не толькі да Бухмана і тых агітатараў, з якімі гутарылі, але да большасці агітатараў фабрыкі. Агітатары не ведаюць, чым вытлумачыць такое становішча. Але-ж ясна—гэта рэзультат таго, што рабочыя не вучаць агітатара ў штодзённым жыцці як чалавека, які можа растлумачыць незразумелае палітычнае пытанне. Адсюль хутчэй ідзе да яго з пытаннем бытавым або вытворчага характару.

У палітычнай агітацыі не ўлічвае ўзросны склад рабочых. На фабрыцы ёсць пераважна моладзь. Але агітатары ў сім рэдка, а некаторыя амаль ніколі не ўзнімаюць спецыфічных пытанняў, больш цікавяць моладзь. Яны рэдка карыстаюцца матэрыяламі «Комсомольской правды».

Не цікавяцца агітатары і тым, правядзеная гутарка штурхае рабочага на работніцу да чытання газеты, кнігі, часопіса, калі звычайна праводзяцца гутаркі (раней было 10, а зараз 20 хвілінаў дзенага перапынку), зусім недастатковы для глыбокага ўяснення таго ці іншага пытання.

Гэтыя недахопы ў палітычнай агітацыі неабходна хутчэй ліквідаваць.

Ц. ФРЫ

АКТЫВІЗАВАЦЬ КОЖНАГА КОМУНІСТА

Большасць выступаўшых комуністаў на справаздачна-выбарчым сходзе завода імя Кірава крытыкавалі партком за тое, што ён уцягваў у актыўную партыйную работу невялікую групу членаў і кандыдатаў партыі. Такая практыка прыводзіла да стварэння важок парткома штатных актывістаў, якія выконвалі розныя партыйныя даручэнні. Асноўная-ж маса комуністаў не ўцягвалася ў партыйную работу, з яе не вырошчвалі партыйныя кадры. А некаторыя комуністы, нават выдатныя стаханаўцы на вытворчасці, заліваліся ў «пасіў».

Новавыбраны партком улічыў указанні комуністаў і ўжо зрабіў пачатак па ўцягненню членаў і кандыдатаў партыі ў актыўную партыйную работу. Зараз у падрыхтоўку пытанняў да партыйных сходаў уцягнуты радавыя члены партыі. Так, група комуністаў (Золаву, Ціханаву, Лапідусу і інш.) было даручана падрыхтаваць на партыйны сход пытанне аб становішчы работы са спачуваючымі, улічваючы ўказанні справаздачна-выбарчага схода. Таварышы Ўсебакова вывучылі гэта пытанне. Добрасумленна падрыхтавалі яго. Дакладчыкам на сходзе быў комуніст Золаў. Абмеркаванне праходзіла актыўна. Комуністы ўносілі каштоўныя прапановы па паляпшэнню работы са спачуваючымі.

Партком сваю работу пабудаваў на калектыўных пачатках. Пытанні, якія павінен абмяркоўваць партком, рыхтуюць некалькі груп комуністаў. Такім чынам на пасяджэнні парткома прысутнічаюць радавыя комуністы, якія разам з членамі парткома абмяркоўваюць пастановы. Так было па-дзелавому падрыхтавана групай членаў партыі пытанне аб становішчы заводскага насценнага друку. Яно было даручана комуністам (Ерынгроз, Кісель, Асаёнак і інш.). Зараз ёсць некаторае паляпшэнне работы заводскага насценнага друку.

Пераглядзены партыйныя даручэнні кожнага члена і кандыдата партыі. Выявілася, што член партыі Чыркун можа выконваць больш адказныя даручэнні. І зараз яму даручылі выконваць работу старшыні совета МОПР.

Былі і адваротныя факты. Напрыклад, комуніст Турэцкі (быў рэдактарам насценнай газеты механічнага цэха). Выконваў ён гэта даручэнне слаба. У яго не было дастатковых газетных здольнасцей, і партком вызваліў яго. Турэцкі зараз з'яўляецца агітатарам у механічным цэху; добрасумленна выконвае ён гэтае партыйнае даручэнне, любіць работу агітатара.

Раней у партыйнай арганізацыі лічылі комуніста Ціханава «пасіўным». Ён не выступаў на сходах, рэдка заходзіў у партком. А на вытворчасці Ціханаў — лепшы стаханавец. Ён выконваў вытворчую норму на 250 процантаў. І зараз па новых нормах ён у сярэднім выконвае на 150 проц. На справаздачна-выбарчым сходзе Ціханаў гаварыў, што з ім партком не лічыўся, што яго штучна залічылі ў пасіўныя. Партыйны сход выбраў Ціханава членам парткома. Зараз ён выконвае актыўна партыйныя даручэнні, выступае на пасяджэннях парткома, на агульных партыйных сходах. Партком усямерна дапамагае Ціханаву ў паляпшэнні тэарэтычнага ўзроўню і ў практычнай рабоце.

Значнае месца ў рабоце зараз займае прапаганда і агітацыя і ўсямернае падняцце палітычных ведаў агітатараў. Сакратар парткома тав. Мацюш праводзіць нарады са спачуваючымі, кіруе агіткалектывам. Зараз уведзена ў сістэму планавасць агітацыйнай работы. Складзен план работы агіткалектыва, а таксама агітатараў у цэхах. Канспекты агітатараў абавязкова правяраё загадчык партыйным кабінетам або сакратар парткома. Агітатары складаюць дзённікі, у якія запісваюцца ўсе пытанні, задаваемыя слухачамі. Кожны агітатар мае карту свету і палітычную карту СССР. Для агітатараў арганізаваны лекцыі навуковых работнікаў па вывучэнню галоўных краін свету. Гэта значна дапамагае авалодваць складаными ведамі марксізма-ленінізма, падняцню палітычнага ўзроўню комуністаў-агітатараў.

Недахопам работы парткома з'яўляецца тое, што яшчэ не наладжана неабходная праверка выканання партыйных даручэнняў. А таму ёсць выпадкі, калі асобныя комуністы недобрасумленна выконваюць партыйныя даручэнні.

Сакратар парткома тав. Мацюш скардзіцца і на райком партыі, які яшчэ неаператыўна кіруе і не дапамагае новым партыйным работнікам. Інструктары райкома пасля справаздачна-выбарчых сходаў не былі ў партыйнай арганізацыі. Яны не гутарылі і не аказвалі неабходнай дапамогі ў наладжанні партыйна-палітычнай работы.

Партыйная арганізацыя зрабіла толькі невялікую частку таго, што патрабуюць у сваіх гістарычных рашэннях Пленум ЦК ВКП(б). Яшчэ далёка да поўнага выканання рашэнняў справаздачна-выбарчага схода. На гэтым нельга супакойвацца. Добры пачатак неабходна зрабіць сістэмай работы партыйнай арганізацыі.

М. АСТАПЕНКА.

НЕ АДЧУВАЮ КІРАЎНІЦТВА

На справаздачна-выбарчым сходзе первічнай партыйнай арганізацыі арцелей «Чырвоны абутнік» і «Каапрамонт» мяне выбралі парторгам. Першы раз мне даручылі адказную работу — кіраўніцтва партыйнай арганізацыяй. Цяжка спачатку самому наладзіць партыйна-палітычную работу, не маючы адпаведнага вопыту.

Мне неабходна штодзённая канкрэтная дапамога райкома, а яна яшчэ не адчуваецца. Вось я склаў план работы. Звярнуўся да інструктара райкома тав. Байдака. Расказаў, што я думаю запісаць у плане. Ён выслухаў, і ўсё адобрыў. А план наш далёка нездавальняючы. Ці нельга было яму больш сур'ёзна пагаварыць са мною, параіць, што неабходна дапоўніць у плане і як практычна ажыццявіць намечаныя мерапрыемствы. Аднак, гэтага не было.

Я ўжо не гавару аб сакратарах райкома або загалчыках аддзелаў, якія зусім мала надаюць увагі так званым малым первічным партыйным арганізацыям. Ніхто з іх ніколі не бывае ў нас і не цікавіцца становішчам партыйнай работы.

Мы арганізавалі школу з беспартыйнага актыва для вывучэння даклада і заключнага слова таварыша Сталіна на Пленуме ЦК ВКП(б). Райком вылучыў прапагандыста. І вось ўжо трое заняткаў былі сарваны, бо не з'явіўся вылучаны кіраўнік.

Мы маем права патрабаваць ад райкома жывога, аператыўнага кіраўніцтва, гэтага патрабуюць рашэнні Лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б). Нам гэта неабходна, каб падняць партыйна-палітычную работу на належную вышыню, каб да канца выкрыць замаскаваўшыхся ворагаў народу, трацкістаў і іх правых саюзнікаў, каб ажыццявіць гістарычныя рашэнні лютаўска-сакавіцкага Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанні таварыша Сталіна.

Парторг ФРЫДМАН.

П. І. ХАДАСЕВІЧ

Сакратар Менскага гаркома партыі.

ДА МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ

Рэалізуючы рашэнні партыі і ўказанні таварыша Сталіна аб задачах другой пяцігодкі, няўхільна ажыццяўляючы ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, Менская гарадская партыйная арганізацыя за прайшоўшы пасля XVII з'езда ВКП(б) першы дабілася раду новых поспехаў у галіне гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

Аб'ём прадукцыі прамысловасці ўзрос з 203 мільёнаў рублёў у 1933 годзе да 285 мільёнаў рублёў у 1936 годзе. За апошнія два гады прамысловасць перавыконвае свой промфінплан. У 1935 г. план выкананы на 106 проц., у 1936 годзе — на 110,7 проц.

Паказальнікам росту добрабыту горада Менска з'яўляецца хаця-б такі фактар, як рост мясцовага бюджэта, не гаворачы ўжо аб агульнадзяржаўным бюджэце. Так, бюджэт гор. Менска ў 1934 годзе складаў 21 мільён рублёў, у 1937 годзе складае 64 мільёны рублёў — павелічэнне ў тры разы. Адпаведна ўзраслі асігнаванні на народную асвету ў 3,5 раза, на ахову здароўя — у 4 разы, жыллёвае будаўніцтва — у 4 разы. За 1935 і 1936 гг. у горадзе пабудавана 12 новых сталінскіх школ, якія далі магчымасць поўнасцю ліквідаваць трэцюю змену ва ўсіх школах.

У 1934 годзе была пушчана ДЭС № 2, што павялічыла магутнасць электрастанцыі ў два разы. Рад паляпшанняў мы маем таксама і ў іншых галінах (ахова здароўя, тавараабарот і т. д.).

Аднак, не гледзячы на ўказаныя значныя поспехі, мы маем рад буйнейшых недахопаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве горада, якія былі выкрыты на апошнім пленуме горсовета па справаздачнаму дакладу прэзідыума.

Горсовет прапаваў незадавальняюча, дапусціў рад прарываў у кіраўніцтве гарадскім будаўніцтвам. Прэзідыум горсовета да канца не зразумеў тых патрабаванняў, якія прад'яўляе да яго Сталінская Канстытуцыя і не зрабіў для сябе неабходных практычных вывадаў. Прэзідыум горсовета аказаўся адарваным ад выбарщыкаў. У партгрупе прэзідыума горсовета не была разгорнута большэвіцкая крытыка і самакрытыка работы асобных аддзелаў, членаў прэзідыума і прэзідыума ў цэлым. За буйнейшыя недахопы ў гаспадарчым кіраўніцтве таксама нясуць не малую адказнасць наркаматы і рэспубліканскія гаспадарчыя арганізацыі.

Гарком партыі не паставіў своечасова з усёй рашучасцю пытанне аб паляпшэнні работы прэзідыума горсовета.

Задача Менскай партыйнай арганізацыі — узначаліць узросшую палітычную актыўнасць працоўных, дабіцца карэннага паляпшэння ў рабоце горсовета з тым, каб поўнасцю ліквідаваць прарывы ў рабоце горсовета і гаспадарчых арганізацый, паставіўшы іх работу на ўзровень патрабаванняў, вынікаючых з Сталінскай Канстытуцыі.

***

Абмеркаванне рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна ў дакладзе і заключным слове на Пленуме, разгарнуўшаяся на партактыве і на справаздачна-выбарчых партсходах большэвіцкая крытыка і самакрытыка дапамаглі нам выкрыць буйнейшыя недахопы і промахі ў стане і кіраўніцтве гаркома і горрайкомаў партыйна-палітычнай работай.

Вынікі выбараў, праведзеныя на аснове закрытага (тайнага) галасавання, сведчаць аб вялікай актыўнасці комуністаў.

На справаздачна-выбарчых партсходах первічных партарганізацый прысутнічала 93 проц. комуністаў (астатнія адсутнічалі па ўважлівых прычынах). У спрэчках па справаздачных дакладах прымала ўдзел 3.696 чалавек — 63 проц. прысутнічаўшых на партсходах. Апрача таго, каля 5.000 чал. выказалася па кандыдатурах, высунутых у парторганы.

У рэзультаце выбараў склад сакратароў парткомаў і парторгаў первічных партарганізацый абнавіўся на 41 проц., а склад парткомаў — на 56 проц.

Актыўна абмяркоўваліся кандыдатуры ў склад новых парторганаў. Кандыдатуры некаторых сакратароў парткомаў ранейшага складу былі адведзены са спісаў як неапраўдаўшыя сябе на партыйнай рабоце і не здолеўшыя забяспечыць партыйнае кіраўніцтва ў сваёй партарганізацыі.

Былы сакратар парткома Наркамзема Жураў хоць і быў пакінут у спісе, але пры тайным галасаванні не быў абран.

Былі адведзены са спісаў былыя сакратары парткомаў тт. Руткоўскі (Наркамясцпром), Шындлер (ЦКНГУ), Далідовіч (завод лапцугоў Галя) і інш.

У склад парткомаў і ў якасці сакратароў парткомаў і парторгаў была выбрана новая група комуністаў, вырасшых за апошнія гады на низавой практычнай партыйнай рабоце. На заводзе імя Кірава сакратаром парткома выбран тав. Мацюш, член партыі з 1928 г., беларус. Да выбрання быў начальнікам механічнага цэха. На фабрыцы «Кастрычнік» сакратаром парткома выбран тав. Галавач, беларус, ордэнаносец. Амаль поўнасцю абноўлена партыйнае кіраўніцтва ва ўсіх буйнейшых ВНУ Менска.

Партыйна-палітычная работа ў ВНУ была самым адстаючым участкам, і ў сувязі з гэтым гарком прыняў рад мер да ўмацавання партыйнага кіраўніцтва ў ВНУ. Група адказных партыйных работнікаў была гаркомам накіравана і рэка мендавана на партыйную работу ў ВНУ, якія пры тайным галасаванні былі выбраны ў члены парткомаў і ў якасці сакратароў парткомаў.

Адначасова трэба адзначыць, што значная група сакратароў парткомаў ранейшага складу ў радзе буйных вытворчых партарганізацый, не гледзячы на вострую крытыку недахопаў іх работы, былі выбраны ў склад новых парткомаў пераважнай большасцю галасоў і пакінуты сакратарамі парткомаў новага складу.

Да іх адносяцца тт. Гефен (фабрыка імя Кагановіча), Буевіч (завод імя Варашылава), Мінкін (завод «Большэвік»), Рабкін (фабрыка «Комунарка»), Раскін (швейная фабрыка імя Крупскай), Левін (шчотачная фабрыка) і рад іншых.

Гэта сведчыць аб тым, што гэты асноўны кадр низавых партработнікаў карыстаецца аўтарытэтам у партыйных масах, што яны зразумелі рашэнні Пленума ЦК ВКП(б) і змаглі ўзначаліць самакрытыку на партыйных сходах.

***

Раённыя партыйныя канферэнцыі таксама прайшлі на аснове большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі недахопаў партыйна-палітычнай работы і кіраўніцтва гаркома і горрайкомаў.

Раённыя партыйныя канферэнцыі з усёй большэвіцкай праматой ускрылі парочныя метады работы і кіраўніцтва гаркома і горрайкомаў. Асабліва рэзка адзначалася адарванасць гаркома і горрайкомаў ад партыйнай масы, недастатковая канкрэтная дапамога ў рабоце первічных партарганізацый.

Значна абнавіўся склад новавыбраных райкомаў: па Сталінскаму райкому на 68 проц., па Варашылаўскаму на 59 проц., па Кагановіцкаму на 44 проц.

Асноўным недахопам прайшоўшых партканферэнцый з'яўляецца тое, што ў справаздачных дакладах сакратароў райкомаў вельмі слаба было асветлена пытанне аб тым, што ўжо зроблена райкомамі па выкананню рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна. Гэта тлумачыцца тым, што як гарком, так і райкомы і первічныя партарганізацыі вельмі слаба перабудоўваюць сваю работу.

Пленум ЦК ВКП(б) абавязаў у двухмесячны тэрмін падабраць і зацвердзіць у новавыбраных парткомах па два намеснікі сакратароў парткомаў. Гэта работа праходзіць вельмі марудна, без дастатковага кіраўніцтва гаркома і горрайкомаў. Пакуль горрайкомамі зацверджана ўсяго 66 намеснікаў, а падлягае зацвярджэнню 220 чалавек. Але нават там, дзе зацверджаны намеснікі сакратароў парткомаў, яны яшчэ вельмі слаба прыцягнуты да практычнай работы.

Вельмі слаба прахо́дзіць выкананне рашэння Пленума ЦК ВКП(б) аб пераглядзе выключаных з партыі за пасіўнасць. Мы маем у Менскай партарганізацыі каля 300 чалавек, выключаных за пасіўнасць і механічна выбыўшых. Між тым, райкомы амаль яшчэ не ўзяліся за выкананне ўказанняў таварыша Сталіна.

На справаздачна-выбарчых партсходах і на раённых партканферэнцыях асабліва рэзкай крытыцы быў падвергнут стан партыйнай прапаганды і палітычнай агітацыі.

Прапагандысцкая работа праводзілася ў нас зачастую схаластычна, адарвана ад бягучых баявых задач партыі. Прапагандысты прыпадносілі слухачам асобныя факты і эпізоды, адарваныя ад грамадзянскай гісторыі, не даючы гэтым фактам і падзеям у жыцці нашай партыі марксісцка-ленінскага аналізу і тлумачэння. У рэзультате атрымлівалася простае завучванне фактаў. Палітычная агітацыя таксама зачастую праводзіцца схаластычна, адарвана ад міжнароднага і ўнутранага становішча СССР. Зусім запушчана палітагітацыя сярод неарганізаванага насельніцтва, а таксама ў радзе дробных прадпрыемстваў і ўстаноў, у інтэрнатах і сярод сезоннікаў. Закінутым участкам з'яўляецца антырэлігійная прапаганда і агітацыя. Гарком і горрайкомы зусім недастаткова зрабілі для рэалізацыі рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна па паляпшэнню справы прапаганды і палітычнай агітацыі.

***

Поспехі соцыялістычнага будаўніцтва выклікалі і выклікаюць шалёную нянавісць ворагаў народу. Не маючы ніякай падтрымкі ў масах, трацкісты, правыя ператварыліся ў беспрынцыповую і бязыдэйную банду шкоднікаў, шпіёнаў і забойцаў, дзейнічаючых па заданнях фашысцкіх контрразведак.

Праверка і абмен партдакументаў і факты апошняга часу з усёй відавочнасцю паказалі, што суседнія фашысцкія дзяржавы сістэматычна перакідвалі на тэрыторыю БССР шпіёнаў і дыверсантаў, некаторыя з іх пранікалі ў рады партыі, прабіраючыся на важнейшыя ўчасткі соцыялістычнага будаўніцтва.

Менская партыйная арганізацыя ў сваёй рабоце зачастую ўпускала з віду асабліва гор. Менска, які з'яўляецца пагранічным з фашысцкімі дзяржавамі гораламі і дзе патрабуецца выключнае праяўленне большэвіцкай пільнасці.

Асноўная палітычная памылка гаркома заключалася ў тым што пасля праверкі і абмену партдакументаў бюро гаркома і горрайкомаў праявілі самазаспакаенне, і за лічбамі выключаных з партыі прагледзелі яўных ворагаў, подлых двурушнікаў, пранікнуўшых да апошняга часу правядзіць сваю шкодніцкую работу на ўчастках (Наркамзем, Наркомасветы, совецкіх пісьменнікаў і т. д.).

У часе праверкі і абмену партдакументаў мы прагледзелі яўных ворагаў, арудвалі ў Белдзяржвыдавецтве і рэдакцыі газеты «Звязда».

Факты пацвярджаюць, што там, партыйная работа была запушчана, асабліва моцна былі развіты элементы чванства, падхалімства і групаўшчыны, дзе глушылася большэвіцкая крытыка і самакрытыка, ворагі народу бесперашкодна праводзілі сваю работу.

Але трэба сказаць, што большэвіцкая крытыка і самакрытыка ў Менскай партыйнай арганізацыі, якая пачала развівацца толькі ў апошні час, разгортваецца яшчэ далёка недастаткова. Менскай партарганізацыі прадстаіць вялікая работа па больш глыбокаму развіццю і гартаванню самакрытыкі це зважаючы на асобы ў адпаведнасці з патрабаваннямі Пленума ЦК ВКП(б) і ўказаннямі таварыша Сталіна.

***

Ворагі народу выкрыты і абяшкоджаны, але яшчэ не выкарчаваны. Мы ні на хвіліну не павінны забываць указанні таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні СССР. Памятаць аб пагранічным становішчы Менска. Памятаць гэта і тлумачыць партыйную арганізацыю ў стане старожанасці і пільнасці.

Таварыш Сталін паставіў перад усімі большэвікамі задачу — авалодаць большэвізмам. Перад намі задача—выхоўваць і вырошчваць кадры партыйных работнікаў, гаспадарнікаў, выхоўваць усіх членаў партыі, дапамагчы ім авалодаць тэорыяй Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

Мы павінны ў бліжэйшы перыяд арганізаваць глыбокае вывучэнне гісторыі нашай партыі ва ўсіх звеннях партыі і комсамола, кіруючыся ўказаннямі таварыша Сталіна.

Гарадская партыйная канферэнцыя павінна абмеркаваць вынікі работы Менскага гаркома за прайшоўшыя амаль тры паловаю гады ўзяць пад большэвіцкую крытыку палітычныя памылкі, дапушчаныя гаркомам.

Менская партыйная арганізацыя з'яўляецца боевзольнай, згуртаванай вакол ЦК шага Цэнтральнага Камітэта, вокал таварыша Сталіна, пад кіраўніцтвам якога мы ішлі і пойдзем да новых баёў за комунізм.

Закрыты размеркавальнік

магазін зайшла грамадзянка і папра- адпусціць ёй 2 кілограмы рысу.
- Рысу ў нас няма,—паследваў адказ ўпчыцы.
- Як няма, калі ў вітрыне ёсць рыс.
- Гэты рыс адпускаецца толькі жыха- Дома спецыялістаў,—ухмыляючыся адказала прадаўшчыца.

кі дылягар адбыўся ў Менску ў мага- № 60 Менхарчгандля 26 мая 1937 гэта значыць праз некалькі год пас- лмены картачнай сістэмы, ліквідацыі іх закрытых размеркавальнікаў; тады, ў Краіне Советаў прадуктаў харча- н, прамысловых тавараў ёсць удо- .

кія дылягі можна тут пачуць што- на. Пакупніцы скардзіцца на тое, што ктар магазіна тав. Лабецкі ператва- дзяржаўны магазін у закрыты раз- авальнік. Рыс, малако, сліўкі і нека- я іншыя тавары адпускаюцца толькі арам Дома спецыялістаў.

каргі законныя. Лабецкі сапраўды ўста- ' такі парадак, што пад відам індыві- льных заказаў на прадукты з дастаў- на дом некаторыя тавары размяр- аюцца паміж вузкім кантынгентам, адаваных ім-жа да магазіна, пакуп- і знаёмымі. 19 мая, напрыклад, ма- атрымаў 400 кілограм рысу, які ркован па такому-ж прынципу.
- Увесь рыс,—заяўляе дырэктар,— праламі на індывідуальных заказах.

тусня. Рыс раздан знаёмым. Калі мы асілі ў Лабецкага дакументы індыві- льных заказаў, ён змог сабраць іх , на 20 кілограмаў, а не на 400. зенна 144 літры малака магазін раз- толькі прымацаваным, 29 мая ў 2 га- ціня мы ў гэтым асабіста ўпэўніліся. адаўна прахожіў сход актыва Нар- нутгандля БССР. На сходзе кіраўніка нікі наркамата і Менгарунутгандля ла гаварылі аб недахопах у сваёй ра- . Сход закончыўся, а грубейшае па- ніе прынцыпаў совецкага гандлю не яецца.

не час усё-ж Наркомунутгандлю ніць гэтыя агідзмасці, а віноўных пры- уць да судовай адказнасці?

С—н.

Аб чуласці і клопатах

гэтым пісьме я хачу расказаць аб ушных і нячулых адносінах Наркам- да сваіх кадраў.

з'яўляюся старшынёй калгаса «Іск- ' схода», Лоеўскага раёна. За добра- ленную работу некалькі раз рай- ком і Наркамзем мяне прэміравалі. выбрана дэлегаткам на Надзвычай- XII З'езд Советаў.

ль перад самым закрыццём з'езда рэзна захварэла і знаходжуся ў 1-й цкай больніцы (Менск).

часе маёй хваробы ніхто з Нарка- не пацікавіўся маім становішчам. аркамат павінен быў ведаць дэлега- з'езда, асабліва старшынь калгасаў.

зрэшце я сама рашыла давесці да ве- іх, што я сур'ёзна хворая і знаход- ў больніцы, лічачы, што можа хто- зь пацікавіцца і прыезе мяне адве- . Але мае мары не збыліся.

чу адзначыць, што большэвіцкую ёсць ка мяне праявіў ЦВК БССР.

хворая, але трымаюся бадзёра, бо не аю, што я нашу ганаровае званне адзянкі Совецкага Саюза.

адзяюся, што апраўдаюся і прынясу тую карысць сваёй радзіме.

Фёкла КЛІМОВІЧ.

—о—

АДПАЧЫНАК ДЗЯЦЕЙ

прыгожых дачных месцах Забашэў- , Глівінскага і Жыцькаўскага сельса- ў Барысаўскага раёна заканчваецца аляванне санаторных лагераў для 900 ераў і школьнікаў Барысаўшчыны- я лагеры адкрыюцца 20 чэрвеня.

НА НАРАДЗЕ АКТЫВА НАРКАМЗЕМА

Трэці дзень працягваецца нарада актыва Наркамзема. Адзін за другім выходзяць на трыбуну ўдзельнікі нарады актыва— пераважна нізавыя зямельныя работнікі. Яны жорстка крытыкуюць работу Наркамзема БССР, выкрываюць факты шкодніцкай дзейнасці класава-варожых элементаў.

Пад агонь большэвіцкай самакрытыкі бярэцца ўсе галіны работы Наркамзема.

Тав. Гдоўскі (Магілеў) ставіць пытанне аб дапамозе машынатрактарным станцыям у будаўніцтве. Далей ён узнімае пытанне аб арганізацыі своечасовага і высокаякаснага рамонту трактараў.

— Сродкі на рамонт трактараў,—гаворыць ён,—адпускаюць у лютым месяцы, а не восенню. Да пачатку палявых работ астаецца мала часу. Рамонт праводзіцца спехам, цяжка знайсці запасныя часткі. Гэта прыводзіць да нізкаякаснага рамонту. З такой нікудышнай практыкай трэба пакончыць.

Аб злачынна безадказных адносінах Наркамзема да планавання сядзіб МТС, да будаўніцтва гаражоў, навесей для машын гавораць тт. Бунько, Муха, Мінін і інш. Кожная МТС будуе па-свойму. Некаторыя дырэктары машынатрактарных станцый у сваіх выступленнях гавораць аб адсутнасці запасных частак для рамонту машын, аб фактах дастачы трактараў без прычэпнага інвентару. У Магілеўскую МТС, расказвае т. Мухін, завезлі новыя трактары, але без плугоў. Відаць, і тут не абышлося без варожай рукі.

Тав. Алмазаў (Лельчыцы) востра крытыкуе Наркамзем за няправільнае планаванне пасеўных плошчаў, за яўна вочкаўцірацельскую арыентацыю ў пытаннях уліку новаасвоеных зямель. У 1934 годзе Наркамзем даў указанні раёнам, каб у зводкі аб новаасвоеных землях уключаць залежы і пералогі, уключаць землі, якія пару год не аралися, хаця яны і ўключаны ў планы севазвароту. Выконваючы гэту дырэктыву Наркамзема, некаторыя райземаддзелы адну і тую-ж плошчу два разы ўключалі ў лік ворнай зямлі. У зводках раслі лічбы новаасвоеных зямель, Наркамзем улічваў іх пры планаванні пасеўных плошчаў, а фактычна ворная зямля не павялічвалася.

— Работнікі Наркамзема, — гаворыць т. Алмазаў,—адарваны ад мас, абюракраціліся. Начальнік зернавога кіраўніцтва НКЗ т. Лабзакоў прыязджаў у Лельчыцкі раён і нават не зайшоў у райземаддзел. Такі важны ўчастак, як насеннаводства, у Наркамземе аддалі бюракрату Загарэльскаму, які нават не выслухоўвае нас, мясцовых работнікаў.

Правільна ўведзеныя і асвоеныя севазвароты—важнейшая крыніца падняцця ўраджайнасці. У гэтым пытанні рэспубліка ўвесь час топчацца на месцы. Борагі з былога кіраўніцтва Наркамзема зрывалі ўвядзенне севазвароту, землеўпарадкаванне, усякім спосабам заблытвалі ўлік пасеўных плошчаў. Аб гэтым гавораць многія таварышы ў сваіх выступленнях. Нават на 1937 год землеўпарадчыкі не сканцэнтраваны так, каб упарадкаваць зямлю пэўнай групы раёнаў, а працуюць ва ўсіх раёнах рэспублікі. Аграномы займаюцца ўвядзеннем севазвароту. У іх узнікае шмат пяясных пытанняў. Здавалася-б, што Наркамзем павінен быў адразу-ж прааналізаваць адзін—два праекты і навучыць людзей. Але так не было. У Наркамземе чакаюць, пакуль з раёна прыязджуць 20—30 праектаў па землеўпарадкаванню, каб потым сказаць, што ...яны складзены няправільна, і пачаць усё заново.

— Такое-ж становішча атрымалася з зернасушылкамі сістэмы Уварава,—гаворыць т. Іваноў (Віцебск).—У мінулым годзе Наркамзем падганяў калгасы будаваць сушылкі. Пабудавалі іх досыць многа, выдаткавалі вялікую суму грошай, матэрыялаў. І што-ж? Аказалася, што сушылкі нягодныя, грошы і праца патрачаны марна.

— У многіх калгасах гаворыць т. Мінін (Дзержынск), вырашчана высокапародная жывёла. Гэтыя калгасы могуць надзяліць племянной жывёлай і сваіх суседзяў. Між тым, сюды завозяць жывёлу значна горшых парод, калгасы без карысці і жадання выдаткоўваюць дзясяткі тысяч рублёў і к таму—пагаршаюць народнасць сваіх стадаў. І такая шкодная практыка праводзіцца пад маскай барацьбы за палепшэнне народнасці жывёлы.

— Як плануюць завоз машын у МТС? Наступіць час бульбу ўбіраць. У МТС ёсць бульбакапалкі, але іх нельга будзе скарыстаць, бо насеў бульбы праводзіўся ўручную, а бульбакапалкі разлічаны на механізаваны насеў бульбы. К пачатку веснавой сяўбы наша МТС атрымала бульбакапалкі, а бульбасаджалкі мы атрымалі толькі ўчора.

— На жаль, — гаворыць т. Мінін,— і ЦК КП(б)Б праглядзеў справы Наркамзема, не ўскрыў іх своечасова. У гэтым не мала і нашай віны. Мы не дапамаглі ЦК партыі своечасова ўскрыць усё тое, што робіцца ў Наркамземе.

Тав. Сярмяжка (Менск) гаворыць аб шкодніцтве ў планаванні.

— На 1937 год Наркамзем так спланаваў пасеўныя плошчы Менскага раёна, што калі яго паслухаць, нам прышлося-б для размяшчэння пасеваў распахаць каля 1.500 гектараў канюшыны. А для якіх культур? Для пасеву вікі. Рабілася так, па маёй думцы, таму, што планавікі Наркамзема ведалі, што насення вікі мы не здабудзем, і такім чынам сарвем план.

Выступіў па актыве і аграном-планавік Наркамзема Шыльнікаў. Яго прамова многа раз перарывалася рэплікамі незадаволенасці. У яго руках канцэнтраваліся ўсе ніці планавання. Удзельнікі нарады чакалі ад яго вострай крытыкі сваёй работы, якая была наруку шкодніцкам. Чакалі, каб ён ускрыў новыя факты. Але ні таго, ні другога не было. І не дзіўна, што многія таварышы рашуча патрабавалі адхілення Шыльнікава ад работы.

Не раскрытыкаваў свае грубыя палітычныя памылкі і начальнік кіраўніцтва землеўпарадкавання НКЗ Фрыдман, які праглядзеў ворагаў народу, арудаваўшых пад яго носам.

Аграном — важнейшая фігура ў сацыялістычнай сельгасвытворчасці. На жаль (гэта адзначалі многія таварышы), у многіх раёнах Беларусі, пока большэвіцкай увагі да аграномаў, не створаны ім патрэбныя ўмовы для работы. Аб Наркамземе і гаварыць не прыходзіцца. Сваіх кадраў ён не ведаў; чым яны жывуць, у чым адчуваюць патрэбу — гэтым ніколі не цікавіўся. Участковыя аграномы зусім закінуты. Павышэннем іх кваліфікацыі ніхто не займаецца. Не лепш становішча і з іншымі спецыялістамі сельскай гаспадаркі, працуючымі ў раёне.

Выступленні паказваюць, што ў многіх раёнах не навучыліся цаніць зямельных работнікаў, забываюць на тое, што людзі ўзначальваюць адказны ўчастак і адчуваюць патрэбу ў дапамозе.

Новаму кіраўніцтву Наркамзема прадстаіць выключна сур'ёзная работа па арганізацыі жалавой дапамогі нізавым зямельным кадрам, па іх большэвіцкаму выхаванню. Але і раённае партыйнае і совецкае кіраўніцтва павінна за гэту работу адказваць не ў меншай меры.

Учора на нарадзе актыва з прамовай выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Валковіч.

170 чалавек пажадалі выступіць у спрэчках. Выступіла 50 чалавек. Актыў, аднак, рашае скончыць сваю работу, каб раз'ехацца на месцы і энергічна ўзяцца за справу.

Нарада актыва Наркамзема яшчэ раз паказала, што асноўная маса зямельных работнікаў — людзі, да канца адданыя нашай партыі. Адчайныя патугі рэшткаў трацкісцкай, правай і іншай контрэволюцыйна-фашысцкай сволачы сарваць пераможнае будаўніцтва сацыялізма, перашкодзіць магутнаму росту нашых калгасаў будуць разгромлены да канца.

Нельга супакойвацца. Выканаць сталінскі лозунг аб авалоданні большэвізмам — важнейшая задача кожнага зямельнага работніка. Большэвіцкая крытыка і самакрытыка, якую да гэтага часу ў Наркамземе глушылі, павінна пранізаць усю сістэму зверху данізу. Толькі гэта забяспечыць выхаванне кадраў, здольных выканаць адказнейшыя задачы, якія стаяць перад зямельнымі органамі.

І. ШЛЯФЕР.

АД'ЕЗД ЗАМЕЖНЫХ РАБОЧЫХ ДЭЛЕГАЦЫЙ

НЕГАРЭЛАЕ, 29 мая. (Кар. «Звязды»). Сёння праз Негарэлае выехалі за граніцу французская, чэхаславацкая, бельгійская, швейцарская, мексіканская і галандская рабочыя дэлегацыі ў колькасці 58 чалавек. Гэтыя дэлегацыі прыязджалі ў Совецкі Саюз на першамайскія ўрачыстасці.

Ад імя французскай рабочай дэлегацыі на імя сакратара ВЦСПС тав. Шверніка была адпраўлена з Негарэлага наступная тэлеграма: «У момант, калі дэлегацыя французскіх профсаюзаў пакідае Совецкі Саюз, мы звяртаемся да вас з сардэчнай удзячнасцю за той гарачы брацкі прыём, які нам быў аказан усімі арганізацыямі і працоўнымі масамі Совецкага Саюза — ад поўначы да поўдня цудоўнай краіны сацыялізма.

Дэлегацыя вітае працоўных актывістаў і правадыроў рабочага класа Краіны Советаў, вітае найвялікшыя перамогі на будаўніцтву сацыялізма, велізарныя перспектывы будучага і тую надзею, якую будаўніцтва і будучае сацыялізма прабуджае ў сэрцах працоўных усяго свету.

Няхай жыве Совецкі Саюз, яго барацьба, перамогі, культурнае і гаспадарчае жыццё, захапляючае нас!

Няхай жыве вялікае будучае, якое ўсяляе велізарныя надзеі ў сэрцах усіх працоўных!

Няхай жыве поўнае вызваленне працоўных усяго свету!

Старшыня французкай рабочай дэлегацыі Моллр».

На імя т. Шверніка была таксама адпраўлена тэлеграма старшыні чэхаславацкай арганізацыі Ірасека.

Роўна ў 13 гадзін 50 мінут дэлегаты экспрэсам выехалі за граніцу.

Б. КАМЕНОЎ.

Стаханаўкі менскай швейнай фабрыкі імя Крупскай, якія выконваюць свае нормы на 150—200 проц. НА ЗДЫМКУ (злева направа): тт. Асіпенка, Дубовік, Атрош, Прус. У другім радзе: тт. Гансеўская і Анісевіч.

Фото Я. Салавейчыка.

КОНТРРЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЦАРКОЎНІКАЎ У ДРЫБІНШЧЫНЕ

У сваёй варожай дзейнасці супроць совецкай улады і калгаснага ладу царкоўнікі ў Дрыбінскім раёне не абмяжоўваюцца толькі адпраўленнем рэлігійных культаў. Іх дзейнасць прыняла яўна контрэволюцыйны характар і суправаджаецца радам гнусных антысовецкіх выступленняў і крымінальных злачынстваў.

Вось факты, якія ярка сведчаць аб гэтым.

Вечарам 23 мая бягучага года ў вёсцы Кішчыцы, Бельскага сельсавета, быў склікан сход калгаснікаў. У дом сацыялістычнай культуры, куды сабраліся калгаснікі, поп кішчыцкай царквы Чарнавусаў Сцяпан падаслаў свайго агента — члена царкоўнага совета Герцава Пятра.

З мэтай сарваць сход, Герцаў выступіў з контрэволюцыйнай прамовай, наводзячы паклёп на совецкую ўладу і комуністычную партыю. Калгаснікі патрабавалі прызваць да парадку абнаглеўшага агента попа. Тады ён пачаў дэбашыраваць, пагражаць калгаснікам расправай. Той-жа ноччу ён зрабіў замах на добрасумленнага калгасніка, актыўнага бязбожніка т. Макаўца. Герцаў П. спачатку імкнуўся напасці на Макаўца з-за вугла, а калі гэта не ўдалося, ён выбіў цэглай акно ў хаце і асколкамі пакла параніў яго.

Царкоўнікі навялі супроць працоўнага насельніцтва адкрытае тэрарызаванне. Выпадкі зрыву сходаў, пагроз забойствам з іхняга боку не адзінкавыя. Апрача таго, гэтыя «святыя» насаджаюць у вёсцы п'янства, хуліганства, гвалтаванне жанчын і спекуляцыю.

На кватэры члена царкоўнага совета Герцава Пятра, у якога пражывае поп Чарнавусаў Сцяпан, заўсёды наладжваецца куцёж за грошы, сабраныя ад веруючых. Царкоўны стараста Цюкаў Захар, дзяк Качанаў Якаў і іх агенты, як і поп Чарнавусаў, непрабудныя п'яніцы. Яны спекулююць гарэлкай і рознымі «боскімі» рэчамі. Іх агент Цыганкоў Ігнат — першы ў вёсцы хуліган і п'яніца. Поп толькі і апіраецца на гэтых людзей, вярбуючы іх для контрэволюцыйнай дзейнасці. Член царкоўнага совета П. Герцаў не раз рабіў спробы гвалціць жанчын, адна з іх— калгасніца — ледзь вырвалася з рук «святога» нягодніка.

Поп Чарнавусаў С., царкоўны стараста Цюкаў Захар і дзяк Качанаў Якаў звілі ў царкве контрэволюцыйнае гняздо, у якое ўцягнуты аднаасобнікі Кірылаў Кірыл, Качанаў Янка, Кірылаў Іван і Качанаў Марка. Перад пачаткам і ў часе перапісу насельніцтва ў гэтай царкве праходзілі нарады з мэтаю зрываць важнейшае мерапрыемства ўрада—перапіс. Адсюль падсылаліся і падсылаюцца куланцкія агенты, якія праводзяць контрэволюцыйную работу.

Часта ў аднаасобніка Цыганкова Ігната, Качанава Якава, які працуе дзяком кішчыцкай царквы, а таксама Герасімава Аляксандра і Смірнова Васіля адбываюцца патаемныя сходы царкоўнікаў. Поп Чарнавусаў, праводзячы «богаслужэнне», адкрыта выступае супроць совецкай улады.

Не карыстаючыся шырокім падтрыманнем насельніцтва, поп Чарнавусаў праз сваіх агентаў разгарнуў яўна жульніцкім спосабам збор подпісаў насельніцтва за царкву. Подпісы фабрыкуюцца адной рукой па 30—40 прозвішчаў. Да гэтай справы прыцягваюць старых і дзяцей нават з іншых раёнаў, дзе ўжо цэрквы закрыты і да гэтага прыходу не належаць. Калі прыходзяць хрысціць дзяцей, поп таксама патрабуе 20—30 подпісаў адной рукой у спісе. Распісваюцца таксама за дзяцей і нерэвякоў. Такім чынам у спісках гэтых пераважна мёртвыя душы.

У Робцаўскім сельсавеце царкоўны стараста з вёскі Затоны Расіючоін — махровы контрэволюцыянер, былы цёрразаданнік, брат якога расстрэлян за бандытызм, арганізуе збор грошай на адкрыццё царквы.

З мэтай запужаць адсталых і веруючых, папы распаўсюдзілі так званае пісьмо ад «бога» з яўна трацкісцка-фашысцкім зместам.

У суседнім Мсціслаўскім раёне поп шамаўскай царквы скарыстоўвае ў сваіх мэтах адсталую аднаасобніцу Радзькову Васю, якая, прытварыўшыся «святою», хадзіла зімой босай, прадае «святую» ваду, абдурвае веруючых.

Зусім зразумела, што насельніцтва абурана гэтымі дзеяннямі папоў і іх агентаў. Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі патрабуюць закрыць царкву ў вёсцы Кішчыцы, а таксама ў Шамаве і інш. мясцах. У Бельскім сельсавеце за закрыццё кішчыцкай царквы падпісалася 3.013 чалавек. Жыхары вёскі, дзе знаходзіцца царква (у вёсцы 200 двароў), зусім не ходзяць у царкву. Калгаснікі-бязбожнікі патрабуюць знішчэння ворагаў сацыялізма.

Якія-ж меры прымаюць раённыя арганізацыі? Яны з-за таго, каб пазбегнуць нібы парушэння свабоды адпраўлення рэлігійных культаў, на самой справе патурающь гнуснай контрэволюцыйнай рабоце царкоўнікаў. Свабода адпраўлення рэлігійных культаў не азначае свабоды контрэволюцыйнай дзейнасці і розных крымінальных злачынстваў. Гэтага не разумеюць дрыбінскія раённыя арганізацыі. Факт-жа, што царкоўны банкіт Герцаў Пятро, які рабіў замах на калгасніка тав. Макаўца, і зараз астаецца непакараным. Не пакараны і іншыя злачынцы.

Контрэволюцыйнай дзейнасці царкоўнікаў у Дрыбінскім раёне павінен быць пакладзен канец.

А. ЛОСЬ.

ПАКУТЫ ПАСАЖЫРАЎ

Да рэволюцыі Лельчыцкі раён быў адным з самых адсталых у Беларусі. Годы большэвіцкіх пяцігодак у корані змянілі аблічча гэтага глухога ў мінулым кутка Палесся. Рост адчуваецца ва ўсім.

І крыўдна, што толькі адна галіна гаспадаркі стварае вялікія непрыемнасці для жыхароў раёна. Гэта — сродкі перасоўвання, шляхі зносін. Адзіным сродкам, звязваючым Лельчыцы з іншымі раёнамі рэспублікі, з'яўляецца чыгуначная вузкакалейка.

Вельмі доўга прыходзіцца чакаць, пакуль поезд кранецца са станцыі. Затым адлегласць у 42 кілометры поезд праходзіць за 10 гадзін. І гэта лічыцца зусім нармальным.

Работнікі дарогі груба абыходзяцца з грамадзянамі. Адноўчы быў такі выпадак. Паравоз, прасхаўшы 15 кілометраў, спыніўся, пасажырам было абвешчана, што нехапае дроў і вады для далейшай язды. Пасажыры вымушаны былі 10 гадзін чакаць другога паравоза...

У мінулым годзе была ўстаноўлена аўтобусная перавозка пасажыраў ад Лельчыц да Мозыра. Машына хадзіла праз дзень, і не магла задаволіць патрэбы пасажыраў. Не гледзячы на гэту акалічнасць, адкрыццё аўтобуснага руху было сапраўднай радасцю для насельніцтва Лельчыцкага раёна. Аднак, гэтая радасць была кароткаю. Яшчэ ў кастрычніку мінулага года аўтобусны рух закрыўся.

Па ўсяму відаць, што гэтае вельмі ненармальнае становішча зусім не турбуе кіраўнікоў Мазырскай акругі і раёна.

М. ЛАЎНІКОВІЧ.

КОННЫ ПЕРАХОД ЧАВУСЫ—МЕНСК

У Чавускім раёне арганізавалася група варашылаўскіх кавалерыстаў, якія ў дзень XVII гадавіны вызвалення БССР ад белапалякаў зробяць конны пераход Чавусы—Менск агульнай адлегласцю 300 кілометраў.

Група арганізавалася з калгаснікаў Благаўскага, Антонаўскага, Пруткоўскага і іншых сельсоветаў. Першыя заняткі групы ў 20 чалавек адбыліся 23 мая. Усе коннікі прыехалі на сваіх конях і сёдлах. У пераходзе будзе прымаць удзел 200 чалавек. Заняткі групы адбываюцца адзін раз у тыдзень.

Д. МАЛЕВІЧ.

а схода секцыі кампазітараў

ліскучая перамога совецкіх піяністаў аршаве і скрыпачоў у Бруселі сведчыць аб тым, што нідзе ні ў якой краіне у музычнае мастацтва не стаіць на та- вышыні, нідзе музычнае мастацтва, ы музыкантаў не акружаны такімі лючымі клопатамі партыі і ўрада, як овецкім Саюзе.

овецкі Саюз становіцца самай музычнай пай у свеце, сусветным цэнтрам му- ай культуры.

ССР, не гледзячы на тое, што ў сваім ічным развіцці адстае ад брацкіх рэс- к (Украіны, Грузіі, Узбекскай ССР), ж з'яўляецца жывым прыкладам ркага росквіту музыкі разам з іншымі мі мастацтва і навукі.

1920—21 гг. БССР не мела ніякіх учальных музычных устаноў, канцэрт- арганізацый, ніводнага музычнага у беларускіх кампазітараў (ды і саміх пазітараў амаль не было); не мела ль ніякай музычнай мастацкай сама- насці. У 1937 годзе мы ўжо маем жаўную Кансерваторыю, тры музыч- вучылішчы, 5 музычных школ. Дзяр- ны тэатр оперы і балета, філармонію, лі значны атрад совецкіх кампазітараў. оцень музычных твораў нашых кампа- раў многія з'яўляюцца дасягненнямі не кі беларускай музыкі, але багатым адам у музычнае мастацтва Саюза. У ёсць некалькі сотняў чалавек кваліфі- аваных кадраў, выхаваных у совецкіх ычных навучальных установах, дзе- кі тысяч гурткоў рабоча-калгаснай, вонаармейскай і школьнай мастацкай адзейнасці.

е гледзячы на гэта, музычнае мастац- ў сваім развіцці далёка адстае не кі ад гаспадарчага будаўніцтва ў рэс- ліцы, не толькі ад усёўзрастаючых па- прапоўных БССР, але адстае і ад су- ных мастацтваў, як літаратуры, тэат- і т. д.

У першую чаргу, адстаюць совецкія кампазітары. Секцыя совецкіх кампазітараў БССР была арганізавана пасля пастаноў ЦК ВКП(б) аб перабудове мастацкіх арганізацый — восенню 1932 года. З самага пачатку свайго існавання секцыя была прадастаўлена на самацёк. Кіруючыя арганізацыі, якія павінны былі штодзённа дапамагаць у працы маладой, яшчэ нявопытнай арганізацыі, зусім не цікавіліся жыццём секцыі, яе творчымі патрабаваннямі, недахопамі яе работы.

Фармальна арганізацыя совецкіх кампазітараў і да гэтага часу лічыцца секцыяй Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Але праўленне ССПБ за пяць год ні разу не цікавілася становішчам работы кампазітараў, ні разу за пяць год на сваіх пасяджэннях не заслухала нават справаздачы бюро секцыі кампазітараў.

Адсутнасць кіраўніцтва кампазітарамі з боку аддзела культуры і асветы ЦК КП(б)Б, з боку Галоўмастацтва НКА, варожая дзейнасць кіраўнікоў Галоўмастацтва (Дунец, Ляшчынскі), прытупленне класавай пільнасці саміх кіраўнікоў секцыі (і ў першую чаргу аўтара гэтых радкоў) стварылі ўмовы для работы ў арганізацыі ворагаў народу, афіцэра дзенікінскай арміі Гіттарца, ярага контрэволюцыянера, нацдэма Дрэйзіна.

Гэтыя «дзяльцы» дабіваліся дэзарганізацыі работы секцыі. Гіттарц, напрыклад, у 1934 годзе па сходзе кампазітараў заявіў, што «ЦК нашай партыі супроць пастаноўкі твораў беларускіх кампазітараў». Гэтай хлуснёй Гіттарц імкнуўся выклікаць незадаволенасць кампазітараў палітыкай партыі. Толькі ў пачатку 1935 года Гіттарц, Дрэйзін, Матысон выключаны з радоў секцыі совецкіх кампазітараў.

Не толькі ў самой секцыі знаходзілі сабе прытулак гэтыя ворагі народу. Яны знаходзілі сабе адналумцаў і актыўных памочнікаў па-за коламі работнікаў музыкі — з контрэволюцыйнага лагера нацдэмаў, з агентаў, шпіёнаў фашысцкіх дзяржаў.

Адным з такіх музычных «ідэолагаў» быў нядаўна выкрыты ворат народу П. Шастакоў. У адным з яго артыкулаў на старонках газеты «Советская Беларусь» мы знаходзім «ідэальны рацэпт» для далейшага развіцця беларускага музычнага мастацтва.

Гэты «рацэпт» заключаецца ў тым, што з беларускай музыкі трэба выгнаць усю спадчыну мінулага, класіку, што беларуская музыка не можа гучэць у сімфанічным аркестры або па раялі, а толькі культура ліры, жалейкі і цымбал поўнасцю вырашаюць праблемы музычнага мастацтва ў Беларусі, што нават беларуская опера павінна загучэць іменна пад цымбалы, жалейкі і ліры, а не пад сімфанічны аркестр.

Так, адмаўляючы музычную культуру, здабытую чалавецтвам на працягу тысячагодзяў, ворагі народу прапаведвалі «самабытны», нацыяналістычны шлях развіцця беларускай музыкі, так яны арыентавалі беларускіх совецкіх кампазітараў.

Вось другая «тэорыя», на першы погляд процілеглая, а на самой справе яна ўзята з таго-ж нацдэмаўскага контрэволюцыйнага арсенала. Дрэйзін у кансерваторыі на лекцыях па гісторыі музыкі даводзіў студэнтам, што «беларуская народная песня нарадзілася ў вельмі люты час царызма і прыгону, ад яе нясе трупой і слязьмі. Навошта яна нам зараз, калі навокал бурліць вясёлае радаснае жыццё. Нам патрэбны рэволюцыйныя песні, а народную песню трэба адкінуць».

Так, прыкрываючыся гучным краснабайствам, «рэволюцыйнай» балбатнёй. Дрэйзін імкнуўся адабраць у працоўных народжаную імі народную песню, якая з повай сілай развіваецца зараз, адабраць багацейшую крыніцу для музычнай творчасці ў нашых кампазітараў.

Некаторыя кампазітары Совецкай Беларусі апынуліся на павадку ў контрэволюцыйных нацдэмаў і на працягу доўгага часу пісалі варожыя нам, антысовецкія па зместу музычныя творы (Равенскі, Аладаў, Чуркін, Тэраўскі).

У такой абстаноўцы пачала сваю работу секцыя совецкіх кампазітараў БССР.

31 мая г. г. адбудзецца справаздачна-выбарчы сход секцыі кампазітараў. Совецкія кампазітары БССР у сваёй творчай рабоце маюць некаторыя дасягненні, але яны здаюцца нізэрнымі ў параўнанні з буйнымі хібамі, недахопамі і палітычнымі зрывамі ў рабоце секцыі кампазітараў.

Палітычная бясклопатнасць і прытупленне большэвіцкай пільнасці, зазнайства і спачыванне на лаўрах, амаль поўная адсутнасць палітвыхаваўчай работы, бесрыццыпная групоўшчына, рэцыдывы рапаўшчыны, адсутнасць большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі і таварыскай творчай атмасферы — вось што мае месца ў секцыі.

А гэта прывяло да таго, што некаторымі кампазітарамі напісана многа песень на нізкапробныя, халтурныя тэксты гора-паэтаў, ворагаў народу—Звонака, Кляшторнага, Зіміёнкі, Шастакова (кампазітары: Іваноў, Равенскі, Тэраўскі, Чуркін). У той час, як лепшыя творы вядучых паэтаў рэспублікі не знайшлі дастатковага адлюстравання ў вакальна-сімфанічнай творчасці нашых кампазітараў.

Кампазітары Цікоцкі, Шчаглоў пісалі музыку да варожых п'ес ворагаў народу Стапэўскага і Зарэцкага — «Ная» і «Мікола Гоман». Усе гэтыя факты прайшлі міма кіраўніцтва секцыі з-за палітычнай слепаты яе кіраўнікоў і мяне асабіста, як старшыні.

Зазнайства дайшло да такіх памераў, што ў некаторых кампазітараў БССР найлепшыя песні кампазітараў ордэнаноснага Дунаеўскага, Александрава — песні, якія надхоплены па ўсяму Совецкаму Саюзу мільёнамі прапоўных, не знаходзілі ўхвалення; яны лічылі, што так не трэба пісаць, а наадварот, процістаўлялі ім свае творы — нізкай якасці, якія безумоўна не знайшлі належнага падтрымання ў прапоўных масах.

Не гледзячы на тое, што да гістарычнай пастановы ЦК ВКП(б) ад 23 красавіка 1932 года ў БССР не існавала рапаўская арганізацыя, на працягу работы секцыі рэцэдывы рапаўшчыны моцна адчуваліся і зараз яшчэ канчаткова не знішчаны.

Гэта выяўлялася галоўным чынам у арыентацыі выключна на масавую песню (у той час, як і масавая песня і буйныя творы оперы нам неабходны), у адмаўленні і нежаданні вучыцца і павышаць сваю кваліфікацыю як непасрэдна музычную, так і працаваць над пашырэннем свайго ідэйна-палітычнага ўзроўню. Захвальванне слабых твораў, выходзячы з прынцыпаў групаўшчыны: Іваноў, Сакалоўскі, Равальскі — з аднаго боку, Кропшер, Ефімаў, Багатыроў — з другога. Усё гэта— рапаўскі груз, які трэба выкарчаваць з практыкі работы секцыі кампазітараў.

У некаторых творах кампазітараў ёсць вялікі груз фармалістычных выкрунтасаў, з аднаго боку, і натуралістычных праяў— з другога, якія да гэтага часу па-сапраўднаму яшчэ не выкрыты з прычыны адсутнасці сапраўднай разгорнутай большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Совецкія кампазітары зусім слаба звязаны з масамі, а некаторыя з іх зусім адарваны ад мас і не ўяўляюць сабе пульса совецкага жыцця, а значыць — не разумеюць сапраўдных вялікіх задач, якія ставіць перад намі, совецкімі кампазітарамі, партыя і ўрад.

Бюро секцыі мала ўвагі надавала кампазітарскаму маладняку, не прыняла належных мер, каб своечасова забяспечыць патрэбныя ўмовы для росту іх.

Секцыя совецкіх кампазітараў БССР, якая зараз стаіць напярэдадні ператварэння ў самастойны саюз совецкіх кампазітараў, мае ўсе магчымасці стаць адным з вядучых творчых атрадаў у сям'і кампазітараў Совецкага Саюза. Для гэтага неабходна карэнным чынам перабудаваць работу ў святле указанняў таварыша Сталіна і рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б).

І. ЛЮБАН.

АД РЭДАКЦЫІ. Друкуючы артыкул тав. Любана, рэдакцыя лічыць, што ў ім не ўсё сказана да канца.

Сход кампазітараў, трэба спадзявацца, разгорне крытыку і самакрытыку, не зважаючы на асобы, скажа аб тым, чаго недасказаў у сваім артыкуле тав. Любан, і такім чынам выведзе саюз на шырокую дарогу, узніме творчыя магчымасці кампазітараў і музыкантаў БССР.

У НАРКАМАЦЕ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ

Брытанскі пасол у Маскве лорд Чылстон звярнуўся 17 мая г. г. да часова выконваючага абавязкі народнага камісара замежных спраў тав. В. П. Пацёмкіна з нотай, у якой, па даручэнню брытанскага ўрада, паведамляе, што брытанскі ўрад, грунтуючыся на станоўчых у прынцыпе адносінах усіх удзельнікаў камітэта па неўмяшанню ў іспанскія справы да адклікання замежных добраахвотнікаў з Іспаніі, прапануе ўжо зараз заклікаць бакі, што змагаюцца ў Іспаніі, спыніць ваенныя дзеянні на час, дастатковы для ажыццяўлення адклікання добраахвотнікаў. Нота запытвае, ці гатоў урад СССР далучыцца да вышэйпамянёнага звароту, і ўказвае, што з аналагічным запытаннем брытанскі ўрад звярнуўся да французскага, германскага, італьянскага і партугальскага ўрадаў.

У адказ на памянёную ноту часова выконваючы абавязкі народнага камісара замежных спраў тав. В. П. Пацёмкін уручыў 27 мая англійскаму паверанаму ў справах п. Мак Кілопу наступную ноту:

«Маю гонар пацвердзіць атрыманне ноты п. пасла ад 17 мая г. г., у якой па даручэнню галоўнага дзяржаўнага сакратара па замежных справах ён паведаміў мне аб намеры брытанскага ўрада звярнуцца да змагаючыхся ў Іспаніі бакоў з заклікам спыніць ваенныя дзеянні на час, неабходны для ажыццяўлення адклікання замежных добраахвотнікаў з Іспаніі, і прасіў паведаміць вас аб тым, ці гатоў урад СССР далучыцца да названага закліку.

Урад Саюза ССР падверг данае пытанне ўважліваму разгляду.

Лічу неабходным адзначыць, пан паверан, у справах, што своечасовасць звароту да законнага іспанскага ўрада і да мяжежнікаў з закліком аб часовым спыненні ваенных дзеянняў у мэтах ажыццяўлення адклікання замежных добраахвотнікаў у той момант, калі яшчэ не дасягнута пагадненне ў пытанні аб адкліканні такавых, не прадстаўляецца ўраду СССР дастатковa відавочнай.

Дарэчы, урад СССР бярэ пад сумненне не толькі своечасовасць, але і эфектыўнасць такога закліку. Урад СССР улічвае, па-першае, відавочную немагчымасць спадзявацца на лаяльнасць мяжежнікаў якія папіраюць пры патуранні некаторых іншаземных дзяржаў элементарнейшыя прынцыпы чалавечнасці і права, — у чым міжнародная грамадская думка нагла пераканана, між іншым, на абураючым прыкладзе крывавага разгрому мірнага горада Герніка, па-другое, урад СССР пры мае пад увагу безрэзультатны вопыт падобнага звароту, ужо меўшы месца ў эпоху барацьбы совецкай Расіі з рускімі мяжежнымі генераламі і з замежнай інтэрвенцыяй.

Тым не менш, урад СССР, жадаючы ўсімі мерамі паскорыць адкліканне з Іспаніі замежных добраахвотнікаў, у тым ліку і замежных рэгулярных войск, што магло-б прывесці да хуткага спынення чалейшага крывапраліцця, гатоў ужо зараз далучыцца да закліку аб спыненні ваенных дзеянняў на час, неабходны для ажыццяўлення адклікання добраахвотнікаў.

Пры гэтым, аднак, прызнаючы немагчымым разглядваць іспанскі ўрад і мяжежнікаў, як роўныя бакі, урад СССР лічыць пажаданай і справядлівай умовай, каб мяжежнікі, першымі падняўшыя зброю супроць законнага ўрада іспанскай рэспублікі, першымі-ж і прыпынілі ваенныя дзеянні супроць яго і першымі-ж пачалі вывад з краіны замежных войск, у тым ліку мараканскіх. Без гэтых папярэдніх гарантый часовае спыненне ваенных дзеянняў магло-б толькі абвастрыць грамадзянскую вайну ў Іспаніі, пайсці на карысць мяжежнікаў і нанесці шкоду законнаму ўраду Іспаніі.

Прыміце і інш.

В. П. ПАЦЁМКІН». (БЕЛТА).

НАВЫ АНГЛІЙСКІ УРАД

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 28 мая. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, англійскі ўрад сфарміраван у наступным складзе:

прем'ер—Невіль Чэмберлен (былы міністр фінансаў), кансерватар;

міністр фінансаў — Джон Саймон (былы міністр унутраных спраў) нацыянал-ліберал;

міністр унутраных спраў — Хор (былы морскі міністр), кансерватар;

міністр замежных спраў — Ідэн, кансерватар;

міністр па справах дамініёнаў (самакіруючыхся калоній) — Мальколм Макдональд;

міністр калоній — Ормсбі-Гор, кансерватар;

морскі міністр — Даф Купер (былы ваенны міністр), кансерватар;

ваенны міністр — Хор-Белліша (былы міністр транспарта), нацыянал-ліберал;

міністр авіяцыі — лорд Суінтон, кансерватар;

міністр па каардынацыі абароны — Інскіп, кансерватар і інш.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Барацьба сямі тысяч тэкстыльшчыкаў Беластока

Ужо больш пяці тыдняў у Беластоку прадаўжаецца забастоўка ў тэкстыльнай прамысловасці. Бастуюць 7 тыс. рабочых, якія змагаюцца за паляпшэнне ўмоў працы. Бастуючыя занялі фабрычныя памяшканні і абвясцілі галадоўку.

На 9 дзень забастоўкі на фабрыцы Бекера была абвешчана галадоўка. Бастуючыя вывезлі на фабрыцы чорны сцяг з намаляваным чэрапам у знак таго, што яны рашылі памерці, але не адступіць. Па пастанове саюза тэкстыльшчыкаў дзеці бастуючых рабочых размешчаны ў сем'ях рабочых, не прымаючых непасрэднага ўдзелу ў забастоўцы.

Рост туберкулёза

Кансерватыўная газета «Час» піша: агульнавядома, што ў Польшчы нагляцаецца вялікая смяротнасць, асабліва ад туберкулёза. У той час, як на 100 тыс. жыхароў у Галандыі штогодна памірае ад туберкулёза 73, у Англіі—84, у Чэхаславакіі—150, у Польшчы памірае 200 чалавек. У Пазнані штогод памірае ад туберкулёза 500 чал. —г. зн. кожны восьмы жыхар горада.

Келецкія клетушкі

У Кельцах—74 школьных памяшканні на 8003 дзяцей. У адным пакоі прыхозіцца пяснічча сямідзесяці дзеям.

Гэта—цёмныя, цесныя, душныя клетушкі, якія прадстаўляюць сабой зізекванне нават над найбольш прымітыўнымі патрабаваннямі пегагогікі. Памяшканні да таго цёмныя, што ў іх павінна ўвесь дзень гарэць святло. На 8 тыс. дзяцей ёсць толькі адзін урач і дзве сястры. У выніку скучанасці дзяцей распаўсюджана кароста.

«Аб нармальнай вучобе і выхаванні ў гэтых умовах не можа быць і гутаркі, але што горш, школа, прыняўшы здаровае дзіця, пасля 7—8 год выпускае амаль заморыша са скрыўленым пазваночнікам і часта з туберкулёзам»,—гаворыць акт абследвання, праведзенага келецкім муніцыпальным советам, падпісаны прэзідэнтам горада.



Конскі завод № 59 вырошчвае добрых чыстапародных скакуноў. НА ЗДЫМКУ: трэніроўка двухгадовага каня на іпадроме завода. Фото В. Лейна (БСФ).

З жыцця Чырвонай Арміі

ЛАГЕРНАЯ ВУЧОБА Ў НАВАЛЬНІЧНУЮ НОЧ

Цёмная дажджлівая ноч. Навальніца. Стрэлы маланак увесь час бразняць хмурную сінь нізка навісшых хмараў. Глуха грукоча навальніца. Дарогі зрыты канавамі быстрых ручайкоў.

Па калоне, якая рушыцца па лесе, імгненна праносіцца загад: «Стой!». У галаву калоны к камандзіру выклікаюцца камандзіры падраздзяленняў. Уручаецца баявое заданне. Адсюль, у некалькіх напрамках, да розных пунктаў патрэбна даць надзейную сувязь.

Ноч, цемра, размокшы грунт, бездарожжа ў разлік не прымаюцца. Сувязь — майстэрскі наведзеныя лініі правадоў — павінна быць, такі загад. А загады выконваюцца дакладна і ў тэрмін.

Старшы лейтэнант т. Каваленка кіруе пракладкай лініі да пункта Н. Туды дарогі няма. Прамая лінія на карце — дужчая лінія — ідзе па суцэльнаму лесу, у некалькіх мясцах перасечанаму балотамі. Прыкметных арыентыраў мала. Компас — дрэнны памочнік ноччу, не разгледзець указанняў яго стрэлак, а святло запаліць—небяспечна, «працўнік» можа выкрыць замысел.

Каваленка вядзе каманду сувязістаў. Быстра і добра працуюць аддзялённы камандзір Мацюшаўскі, курсанты Візін, Лапін, хутка разматваючы катушкі кабеля; яны не адстаюць ад камандзіра. З кожнага сустрэчнага куста падаюць каскады вады, ногі правальваюцца ў выбкую глебу. У 10—12 кроках губляюцца, расплываючыся ў цемры, фігуры таварышоў. Вопратка сувязістаў прамокла наскрозь.

Чатыры... пяць катушак размотаны. Каманда — «стой!». Спешна будуецца палявая тэлефонная станцыя. Праз аднудзве мінуты яна гатова. Тэлефаніст прагна прынік да мікрафона.

— Масква... Масква.

У адказ — выразнае «Я, Масква».

Лінія ўстаноўлена і дзейнічае.

У бурную навальнічную ноч падраздзяленне тав. Каваленкі бліскуча справілася з задачай. За 40 мінут была пабудавана 4-кілометравая, безадказна працуючая лінія.

П. ВАЛЬД.

ВЯЛІКАЯ АБАРОННАЯ МАСОЎКА

Сёння рабочыя і работніцы мінскай фабрыкі «Комунарка» разам са сваімі сем'ямі асобным поездам выедуць на масоўку ў Ждановічы. Масоўка носіць абаронны характар. Пасля невялікага даклада на тэму: «Мацуй абарону краіны» будуць наладжаны ваенна-спартыўныя гульні, крос на 500 і 1000 метраў, здача норм на варашылаўскага стралка, знаёмства з куляметам і т. д.

10 курсантаў Беларускай кавалерыйскай школы прадэманструюць майстэрства варашылаўскіх коннікаў, інструктары ППХА пазнаёмяць удзельнікаў масоўкі з прыменяннем і значэннем дымавых завес. Тут-жа на масоўцы будзе праведзен шахматна-шашачны турнір, артысты Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра дадуць канцэрт.

МАСТАКІ І СКУЛЬПТАРЫ БССР ДА XX ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА

Да XX гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі рыхтуецца ўсебеларуская выстаўка выяўленчага мастацтва. Выстаўка адкрыецца ў Мінску. Для яе будзе прадстаўлена 250—300 новых карцін і скульптур.

Зараз мастакі і скульптары ўзмоцнена працуюць над эскізамі карцін і скульптур. Мастак Манасзон піша карціну «Уваход Чырвонай Арміі ў Менск у 1920 годзе». Над скульптурамі «Таварыш Сталін з піянэрамі» працуе Грубе, над бюстам Сталіна — Азгур. Карціну «Здабыча торфу багерам» піша мастак Дучыц. Мастак Мірынгоф піша карціну «Сплаў лесу ў БССР», Пашкевіч — «1920 год на Беларусі» і т. д.

24 БАКСЁРЫ НА РЫНГУ

Сёння ў Менску, Ерэване і Іванаве праводзіцца другі круг розыгрыша ўсесаюзнага асабістага першынства па боксу. У Менску спаборніцтвы адбудуцца сёння ў летнім тэатры гарадскога парка імя Горкага. На рынг выйдуць 24 мацнейшыя баксёры Саюза пяці вагавых катэгорый. Сярод іх чэмпіён СССР Чудзінаў (Масква) і Каюраў (Баку), майстры бокса Сераў, Загаруйчанка (Ленінград), Бірк, Штэйн (Масква), Бакрадзе, Горгаслідзе (Тбілісі), Кітасаў (Баку). Ад БССР сёння баксіруюць малады баксёр Добруша Цыганкоў і здольны менскі баксёр лёгкай вагі Коган. Усяго сёння адбудзецца 12 баёў. Спаборніцтвы пачнуцца ў 8 гадзін вечара.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎНУТРАНАЯ ПАЗЫКА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

(выпуск чацвертага года)

ВЫСПРОЙГРЫШНЫ ВЫПУСК

Справачная табліца першага тыража выйгрышаў.

Тыраж выйгрышаў праводзіўся 1 мая 1937 года ў Маскве. У тыражы выграна адзін мільён выйгрышаў агульнаю суму 164.920.000 рублёў.

Указаныя ў табліцы нумары серый нумары аблігацый выйгралі ва ўсіх разрадах выйгрышнага выпуску.

Выйгрышы выплачваюцца апісі касамі па афіцыйных табліцах, апублікаваных у газетах: «Правда», «Известия ЦИК СССР и ВЦИК», «Труд» і «Экономическая жизнь», а таксама па афіцыйных табліцах, выданых Галоўным упраўленнем дзяржаўных працоўных рэзерваў і Дзяржаўнага крэдыта.

ВЫЙГРЫШЫ ВЫПАЛІ НА НАТУРАЛЬНЫЯ НУМАРЫ СЕРЫЯЎ І АБЛІГАЦЫЯЎ

Серыя	Нумар аблігацыі	Выйгрыш	Серыя	Нумар аблігацыі	Выйгрыш
00285	1—50	200	10864	10*)	[illegible]
00309	49*)	500	10968	17*)	[illegible]
00743	36*)	1.000	10989	26*)	[illegible]
01088	40*)	500	11029	1—50	[illegible]
01109	1—50	200	11370	1—50	[illegible]
01273	22*)	500	11571	48*)	[illegible]
01333	29*)	500	11676	1—50	[illegible]
01567	1—50	150	11690	37*)	[illegible]
01581	09*)	500	11870	16*)	[illegible]
01681	1—50	200	12443	24*)	[illegible]
01840	1—50	200	12617	20*)	[illegible]
01879	1—50	150	13091	45*)	[illegible]
01913	23*)	500	13235	33*)	[illegible]
02269	19*)	500	13456	1—50	[illegible]
02568	03*)	500	13964	05*)	[illegible]
03137	26*)	500	14189	04*)	[illegible]
03258	1—50	150	14322	38*)	[illegible]
03315	15*)	1.000	14525	18*)	[illegible]
03487	09*)	500	15017	22*)	[illegible]
03502	34*)	500	15321	1—50	[illegible]
03617	1—50	150	15376	1—50	[illegible]
03700	08*)	500	15454	1—50	[illegible]
03901	1—50	150	15558	1—50	[illegible]
03934	16*)	500	15583	18*)	[illegible]
04075	48*)	500	15770	34*)	[illegible]
04547	37*)	500	16013	40*)	[illegible]
05139	1—50	200	16077	1—50	[illegible]
05142	1—50	200	16337	47*)	[illegible]
05491	19*)	500	16616	1—50	[illegible]
05555	1—50	200	16938	1—50	[illegible]
06425	1—50	200	17483	49*)	[illegible]
06719	1—50	150	17489	1—50	[illegible]
06770	1—50	200	17541	1—50	[illegible]
06878	14*)	500	17582	44*)	[illegible]
06952	1—50	200	17725	1—50	[illegible]
07101	07*)	500	17815	1—50	[illegible]
07257	46*)	500	18007	16*)	[illegible]
07631	1—50	200	18095	1—50	[illegible]
07770	1—50	150	18188	1—50	[illegible]
07875	37*)	500	18217	50*)	[illegible]
07909	1—50	150	18258	35*)	[illegible]
07915	03*)	500	18347	03*)	[illegible]
07965	1—50	200	18505	1—50	[illegible]
08027	25*)	500	18616	1—50	[illegible]
08874	01*)	1.000	18823	1—50	[illegible]
08935	1—50	200	19034	10*)	[illegible]
09122	1—50	150	19110	26*)	[illegible]
09229	25*)	500	19218	45*)	[illegible]
09312	03*)	500	19723	49*)	[illegible]
10395	1—50	150	19807	1—50	[illegible]

*) Астатнія 49 нумароў аблігацый і серыі выйгралі па 150 рублёў кожны.

Ад Магілеўскага РК КП(б)Б

Згубленыя: партбілет за № 1318446, выданы Кіеўскім РК ВКП(б) г. Масквы на імя Дзада Канстанціна Саркісавіча; партбілет № 0858242, выданы Магілеўскім РК КП(б)Б на імя Злебавай Анны Іларыонаўны; партбілет за № 0875327, выданы Магілеўскім РК КП(б)В на імя Кірычэнка Ульяны Нікіфоровны, лічыць несапраўднымі.

Сакратар Магілеўскага РК КП(б)Б КЛІМЧУК.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ПАЎНОЧНЫ ФРОНТ

Спецыяльны карэспандэнт ТАСС в Більбао паведамляе, што 27 мая на біскайскім фронце рэспубліканскія войскі пры падтрыманні авіяцыі нанеслі мяжежнікам моцны ўдар на ўчастку Ордунья — Барамбіо (на поўдзень ад Більбао). Дзеянням войск папярэднічала артылерыйская падрыхтоўка. Пасля доўгага бою рэспубліканцам удалося адцясніць праціўніка да высаты Собрэ-Айя. Мяжежнікі панеслі вялікія страты.

27 мая авіяцыя інтэрвентаў увесь дзень бамбардыравала тэрыторыю ад Більбао да Ордунья, а таксама гарады Мунгія і Гатыка (на паўночны ўсход ад Більбао).

27 мая ў заходняй частцы горада Овіэдо (галоўнага горада Астурыі) войскі астурыйскіх гарнякоў узарвалі рад мінных галерэй і прымусілі мяжежнікаў пакінуць добра ўмацаваныя блакгаузы.

Як паведамляе агенцтва Гавас з Мадрыда, у афіцыяльнай зводцы, апублікаванай 28 мая ўвечары, гаворыцца, што на біскайскім фронце рэспубліканцы ў разультаце атакі занялі некалькі непрыяцельскіх пазіцый. Мяжежнікі панеслі вялікія страты.

У сектары Ордуньі бані прадаўжаюцца.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 28 мая. (БЕЛТА). Спецыяльны карэспандэнт агенцтва Эспань у Більбао паведамляе, што яму ўдалося наведаць лінію фронта ля гор. Мунгія. На фронце некаторае зацішша. Горад, у якім яшчэ нядаўна кіпела жыццё, ператворан у груду руін. Батарэі мяжежнікаў маюць магчымасць бамбардзіраваць горад і прылягаючыя дарогі з узвышша Гонхраменді і іншых бліжэйшых узгоркаў. Аднак, баскскія дружыннікі так цвёрда ўмацаваліся ў Мунгіі, што не падпускаюць мяжежнікаў да самага горада.

Карэспандэнт аглядваў кулямёты, захваченыя рэспубліканцамі на гэтым участку фронта ў мяжежнікаў. Гэтыя кулямёты — італьянскай вытворчасці.

МАДРЫДСКІ ФРОНТ

Рэспубліканскія войскі занялі на гвадалахарскім фронце (на паўночны ўсход ад Мадрыда) пазіцыі мяжежнікаў каля Эспіноса і Ла Муала, а таксама бёску Эспінгарэс, у якой мяжежнікі, адступаючы, кінулі некалькі грузавікоў і значную колькасць боепрыпасаў. Рэспубліканская авіяцыя бамбардыравала пазіцыі мяжежнікаў на поўнач ад Гвадалахары і ў правінцыі Авіла.

Рэспубліканская артылерыя і авіяцыя бамбардыравалі пазіцыі праціўніка на поўдзень ад ракі Тахо. У гэтым раёне большасць камунікацыйных ліній мяжежнікаў знаходзіцца пад агнём рэспубліканцаў. Артылерыйскаму абстрэлу падвергся таксама горад Толедо і яго ваколіцы.

БАМБАРДЫРОЎКА ВАЛЕНСІІ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзідэнцыя ўрада), 28 мая. (БЕЛТА). Сёння ноччу ў тры гадзіны самалёты мяжежнікаў бамбардыравалі Валенсію. Бомбы ўпалі ў цэнтры горада і ў порт. Сярод грамадзянскага насельніцтва шмат афяр.

***

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 28 мая. (БЕЛТА). Паведамляючы аб бамбардыроўцы Валенсіі, агенцтва Гавас указвае, што самалёты мяжежнікаў, вылецеўшыя, як відаць, з горада Пальма на востраве Майорка, скінулі каля 50 бомб у цэнтральную частку горада і ў порт Валенсіі. Згодна папярэдніх вестак, налічваецца 30 забітых і 100 раненых.

У часе бамбардыроўкі порта адна бомба ўпала на палубу англійскага судна «Кэбін», стаяўшага ў валенсійскім парту. 7 чалавек з экіпажа забіты і 8 ранены; з іх—тры цяжка. Судно затанула. Шмат дамоў разбурана бамбардыроўкай. 4 бомбы ўпалі за 80 метраў ад будынка французскага пасольства. Ад запальвальнай бомбы ўзнік пажар у будынку французскага банка.

ПРАЦОЎНЫЯ ФРАНЦЫІ ДАПАМАГАЮЦЬ БІЛЬБАО

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 28 мая. (БЕЛТА). Камітэт дапамогі Більбао, старшынёй якога з'яўляецца Вайян Кутур'е, член ЦК французскай компартыі, адправіў 26 мая 60 тон прадуктаў харчавання ў Більбао. Французскі параход, які даставіць гэтыя прадукты ў Більбао, ідучы назад, прывязе баскскіх дзяцей ва Францыю. Французскае ваеннае судно будзе суправаджаць гэты параход для абароны яго ад нападу мяжежнікаў.

Пры адпраўцы грузавікоў з харчаваннем для пагрузкі на параход у парыжскім прадмесці Монтрэй адбыўся мітынг. Прысутнічала 16 тыс. чалавек. Выступаў генеральны сакратар французскай компартыі Марыс Торэз, які заклікаў да аказання дапамогі рэспубліканскай Іспаніі.

НА ПАСЯДЖЭННІ СОВЕТА ЛІГІ НАЦЫЙ

ЖЭНЕВА (горад у Швейцарыі, месцапрабыванне Лігі нацый), 28 мая. (БЕЛТА). Учора на пасяджэнні совета Лігі нацый была агалошана англа-французская нота генеральнаму сакратару Лігі Авенолю. У ноце паведамляецца аб перагаворах Англіі і Францыі з Бельгіяй і аб англа-французскім паведамленні ад 24 красавіка, якое вызваляе Бельгію ад абавязапельстваў па Локарнскаму дагавору ў адносінах Англіі і Францыі.

У сувязі з агалашэннем ноты, міністр замежных спраў Францыі Дэльбос заявіў, што перашкоды на шляху да заключэння новага пагаднення заходніх краін, замест ранейшага Локарнскага дагавора, не аслабілі жадання французскага ўрада дабіцца пагаднення. Аднак, урад не забывае аб «неразрыўнай сувязі паміж бязапаснасцю ў Захоўняй Еўропе і бязапаснасцю ва ўсёй Еўропе ў цэлым».

«Бязапаснасць на Захадзе, — указаў Дэльбос, — не можа быць дасягнута на шкоду бязапаснасці ўсёй Еўропы. Урад французскай рэспублікі разглядае пагадненне заходніх краін як уклад ва ўмацаванне ўсеагульнага міру, і спадзяецца, што дзякуючы супрацоўніцтву ўсіх зацікаўленых краін, гэта пагадненне прывядзе да шырокага ўзаемаразумення паміж краінамі Еўропы».

Пасля Дэльбоса выступіў англійскі міністр замежных спраў Ідэн. Паводле слоў Ідэна, англійскі ўрад спадзяецца што ў рэзультаце перагаворах з Бельгіяй будзе аблегчана магчымасць перагаворах з больш шырокім кругам удзельнікаў і больш шырокае супрацоўніцтва ўсіх зацікаўленых краін.

Міністр замежных спраў Бельгіі Спаак падкрэсліў, што «Бельгія мае намер усімі сіламі абараняць свае граніцы супроць агрэсіі і перашкодзіць агрэсару карыстацца яе тэрыторыяй для праходу войск ці ў якасці базы для ваенных аперацый на сушы, на моры ці ў паветры». Бельгія указаў Спаак, астаецца верная статуту Лігі нацый і выцякаючым са статута абавязапельствам.

СЁННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

Памяшканне Беллаярждрамтэатра ГАСТРОЛІ МАСКОЎСКА ТЭАТРА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ 1, 2 і 3 чэрвеня ГОД 19-ты.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР (БДДТ) зачыніў зімовага сезона СКУПЫ

Памяшк. Дзярж. Ж'ўрейск. тэатра БЕЛДЗЯРЖТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА Абан. № 51. ФЛОРЫЯ ТОСКА

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА» ТРЫНАЦЦАЦЬ

Гукавы кінатэатр «Пролетарый» ЖАНІЦЬВА

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» ПЕТЭР

Гукавы кінатэатр «Спартак» ДАРЫКО

Дзіцячы гукавы кінатэатр пасля рамонту адкрываецца з 1 чэрвеня

РАДЫЁПЕРАДАЧЫ НА 30 МАЯ:

8.30 — «Акошкія паведамленні». 10.30 — канцэрт для дзяцей 13.15 — аграгутэрка. 13.30 — літаратурная перадача на польскай мове. 14.20 — канцэрт па заяўках радыёслухачоў. 16 — канцэрт. 17.15 — выступленні малодых ж'рэйскіх совецкіх пісьменнікаў. 18.15 — міжнародны агляд. 19.15 — літаратурная перадача 19.50— трансляцыя оперы.

ДЗЯРЖ. ВЫД-ВА «ХУДОЖЕСТВЕННАЯ ЛИТЕРАТУРА»

АДКРЫТА ПАДПІСКА на 2-ое ПАЎГОДДЗЕ 1937 года на ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІЯ ЖУРНАЛЫ

Назва журналаў	Колькасць № у год	Падпісная цана: На 6 мес.	На 3 мес.	Цана асобнага нумара
МАСКВА				
Знамя	12	15—	7.50	2.50
Литературное обозрение	24	9.00	4-50	—60
Интернациональная литература на русск. языке	12	15—	7.50	2.50
Интернациональная литература на англ. языке	12	12—	6—	2—
Интернациональная литература на франц. языке	12	12—	6—	2—
Интернациональная литература на нем. языке	12	12—	6—	2—
ЛЕНІНГРАД				
Звезда	12	15—	7.50	2.50
Литературный современник	12	15—	7.50	2.50

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА усімі адзяленнямі, магазінамі, кіёскамі, упаўнаважанымі К°ГИЗ'а. Саюздрукам і ўсюды на пошце, а таксама ў галоўнай канторы КОГИЗ'а—Масква, Марасейка.

У адпаведнасці з пастановай прэзідыума ВЦСПС ад 21 мая 1937 г. «Аб парадку выканання рашэнняў VI пленума ВЦСПС аб упраўленні Саюзпрофаў».

Прэзідыум Цэнтральнага Совета Профсаюзаў БССР

СТВАРЫЎ ЛІКВІДКОМ

Ліквідком ЦСПСВ знаходзіцца па плошчы Волі, Дом працы, 2 паверх, пакой № 1.

Усе прэтэнзіі з боку арганізацый і асоб, якія ёсць да ЦСПСВ і да Гомельскага, Віцебскага, Магілеўскага, Варыса ўскага, Вабруйскага, Аршанскага, Рэчыцкага, Полацкага, Мазырскага, Горрайпрофсоветаў, павінны быць прад'яўлены ў ліквідком у 10-дзённы тэрмін з дня гэтай аб'явы.

Прэтэнзіі, заяўленыя па скананні ўказанага тэрміну, ліквідкомам ЦСПСВ разглядацца не будуць.

ЛІКВІДКОМ ЦЭНТРАЛЬНАГА СОВЕТА ПРОФСАЮЗАЎ БЕЛАРУСІ.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ ТЭХНІКІ (Комсамольская, 25)

31 мая ў Цэнтральным доме тэхнікі адбудзецца ДАКЛАД старшыні Дзяржплана БССР тав. ЛЮБОВІЧА А. Ц. на тэму: „АБ ТРЭЦІМ ПЯЦІГАДОВЫМ ПЛАНЕ БССР".

Пачатак даклада роўна ў 2 гадзіны дня. Запрашаюцца гаспадарнікі, ІТР, навуковыя работнікі, рабочыя-стахановцы г. Менска.

Дырэкцыя Цэнтральнага Дома тэхнікі.

ГРАМАДСКІ УНІВЕРСІТЭТ СОЦЗЕМЛЯРОБСТВА

даводзіць да ведама, што 1 чэрвеня г.г. адбудзецца ЛЕКЦЫЯ прафесара ПІСАРЭВА (Масква) на тэму: „Навейшыя дасягненні ў селекцыі с.-г. раслін"

Лекцыя адбудзецца ў Доме тэхнікі (Комсамольская, 25). Пачатак лекцыі роўна ў 6 гадзін 30 мінут.

ОРГБЮРО БЕЛ. НІТТ СОЦЗЕМЛЯРОБСТВА.

ГУУЗ НАРКАМАТА АБАРОННАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ Ленінградскі інстытут дакладнай механікі і оптыкі з 20 чэрвеня па 1 жніўня 1937 г. абвяшчае ПРЫЁМ ЗАЯЎ на першы курс інстытута.

Інстытут рыхтуе інжынераў-механікаў шырокага профіля па спецыяльнасцях:
1. Дакладная механіка і
2. Оптыка-механічная.

Тэрмін навучання 5 год з адрывам ад вытворчасці.

Прыёмныя іспыты з 1 па 20 жніўня 1937 г. па матэматыцы, рускай мове, палітграмаце, фізіцы, хіміі і адной з замежных моў па праграмах Усесаюзнага камітэта па справах вышэйшай школы.

Іншагародніх у часе прыёмных іспытаў прадастаўляецца інтэрнат.

Залічаныя ў лік студэнтаў іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам. Сем'і студэнтаў інтэрнатам не забяспечваюцца. Стыпендыя ў памерах па нормах ВТПУ Наркамата абаронай прамысловасці.

АДРАС: Ленінград, Даемідаў пер., 19, тэл. 1-35-83, дадатковы — 7.

Гукавы кінатэатр «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ» АД 31 МАЯ на экране гукавы замежны фільм з удзелам ЧАРЛІ ЧАПЛІНА АГНІ вялікага горада

МЕНЛАРКУ ПАТРАБУЮЦЦА АФІЦЫЯНТКІ і работнікі па продажу марожанага

ЗВЯРТАЦЦА: Энгельса, 8.

ТЭЛЕФОН АДДЗЕЛА АБ'ЯЎ— 21-845.

ДРУКАРНІ «ЗВЯЗДА»

ПАТРЭБНА СКЛАДАЧНАЕ ПАМЯШКАННЕ

Звяртацца: Совецкая, 63, другі паверх, кантора друкарні

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

Уп. Галоўлітсела № К—2109.

Друкарня газеты «Звязды». Менск, Совецкая, 63.

К., К., С.